БАРАЦЬБА ЗА ВАДУ 11

ПАРАЛІМПІЙЦЫ. МОЦНЫЯ ДУХАМ 12

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

15 ЖНІЎНЯ 2020 г. СУБОТА № 158 (29272)

ЛІЧБА ДНЯ

Больш як 6,5 млн тон збожжа

намалацілі ў краіне па стане на 14 жніўня. Збожжавыя і зернебабовыя культуры (акрамя кукурузы, грэчкі і проса) убраны з 1,74 млн га, што складае 79,3 % запланаванай плошчы. Сярэдняя ўраджайнасць па краіне — 37,8 ц/га (у 2019 годзе ўраджайнасць на аналагічную дату складала 31,9 ц/га). Мінская вобласць пераадолела мяжу ў 1,5 млн тон збожжа, Брэсцкая і Гродзенская — у 1 млн тон.

Дзеля будучыні

Учора ў Мінску і іншых гарадах выказаць сваё меркаванне аб тым, што адбываецца ў краіне, выйшлі прадстаўнікі прадпрыемстваў. Федэрацыя прафсаюзаў Беларусі выступіла са зваротам з нагоды падзей, што адбываліся ў апошнія дні і ў прыватнасці ўчора.

«Людзей, якія выходзяць і збіраюцца на пляцоўках заводаў і фабрык, хвалюе напружаная, неспакойная атмасфера і бяспека на вуліцах нашых гарадоў, — гаворыцца ў звароце найбуйнейшай грамадскай арганізацыі краіны. *— У Федэрацыю прафсаюзаў паступаюць шматлікія звароты ад працоўных калектываў з просьбай заклікаць усіх як мага хутчэй спыніць гвалт, не правакаваць канфлікты, захаваць мір у нашай краіне. Сёння людзей непакоіць пытанне найхутчэйшага вызвалення іх дзяцей, родных, калег, якія былі затрыманыя. Размова ідзе пра тых, хто апынуўся ў месцах правядзення вулічных акцый і не парушаў грамадскі парадак. Мы падзяляем гэтыя заклікі і настойваем, каб органы правапарадку як мага хутчэй вызвалілі гэтых людзей і правялі адкрытае і аб'ектыўнае расследаванне па кожным выпадку. Федэрацыя прафсаюзаў Беларусі акажа любую неабходную дапамогу: юрыдычную, псіхалагічную, матэрыяльную — тым, хто апынуўся ў складаным становішчы. Мы заклікаем усіх спыніць гвалт і прыйсці да мірнага дыялогу дзеля будучыні кожнага з нас і нашай Беларусі».*

Спадчына

ДОМ «ЭЛЕКТРЫЧНАГА ЧАЛАВЕКА»

Маляўнічыя руіны на беразе Нёмана, за восемдзесят кіламетраў ад Мінска, — родавы маёнтак беларускага вучонага Якуба Наркевіча-Ёдкі, чые даследаванні апярэдзілі свой час. Папулярнасць прафесара Наркевіча-Ёдкі ў навуковых колах сучаснікі параўноўвалі з папулярнасцю Луі Пастэра, а значнасць яго даследаў — з навуковым значэннем адкрыццяў Вільгельма Рэнтгена.

Навуковыя пошукі беларускага прафесара апярэдзілі свой час. Гэтаму ўнікальнаму навукоўцу належаць адкрыцці ў галіне фізікі, метэаралогіі, медыцыны і псіхалогіі. У сваёй сядзібе ён стварыў адну з першых ва Усходняй Еўропе метэаралагічных станцый. А яго дом можа стаць у перспектыве дзіцяча-юнацкім навуковым цэнтрам, які будзе адкрываць свету новыя імёны ў навуцы.

СТАР. 8

Уязная брама ўжо адноўлена. Над ёю — герб роду Наркевічаў-Ёдкаў.

КАРАТКА

- **Прафсаюзы аказалі дапамогу медустановам Магілёва.**
- Вынікі прыёмнай кампаніі ў Акадэміі кіравання падвядуць у анлайн-фармаце.
- **«Белавія» з 20 жніўня пачне выконваць чартарныя рэйсы ў Туніс.**
- Дакладнасць сутачных прагнозаў надвор'я па абласцях Беларусі ў І паўгоддзі была вышэй за 98 %.
- **Больш за 80 % экспарту тавараў праз БУТБ прыпадае на краіны Еўрасаюза.**
- Генпланы развіцця Смалявіч, Рудзенска і Фаніпаля прадставяць для грамадскага абмеркавання.
- **Шклозаводы Беларусі нарошчваюць выпуск тары для харчовай прамысловасці.**
- Выстаўка «Белагра-2020» пераносіцца на 29 верасня — 4 кастрычніка.
- **У Беларусі павялічаны цэны на каштоўныя металы, якія скупляюць у фізічных асоб.**

На скрыжаванні думак

БЕЗ ПАМЫЛАК НЕЛЬГА РУХАЦЦА НАПЕРАД,

або Чаму попыт і прапанова пакуль не заўсёды супадаюць

Давайце разам прыгадаем свае першыя крокі ў школе. Што кажа дзецям настаўнік? «Сталі роўна, закрылі рот, на мяне глядзім, поўная цішыня, а цяпер ціхенька садзімся». Маленькім вучням давядзецца даведацца, што, для таго каб размаўляць, трэба падняць руку, а замест прывітання трэба моўчкі ўстаць. Ты хочаш пасядзець і падумаць, але ў гэты момант гучыць званок і ўсе павінны выйсці з класа. А іншаму, наадварот, трэба падчас урока пахадзіць, але ўставаць з-за парты катэгарычна нельга. У школе ўсё ўсур'ёз і надоўга — на цэлых адзінаццаць гадоў! І твае індывідуальныя патрэбы і асаблівасці характару там мала каго цікавяць. А школьныя адзнакі? Класік гуманнай педагогікі Шалва Аманашвілі параўнаў іх з вінтоўкай, нацэленай у лоб дзіцяці. Якой павінна быць матывацыя: унутранай ці знешняй? Уласнай ці прымусовай? Ці патрэбныя ўвогуле ў школе адзнакі? Хто выступае галоўным заказчыкам адукацыі: дзяржава ці бацькі? Гэтыя і многія іншыя пытанні аказаліся ў цэнтры ўвагі ўдзельнікаў 3-й канферэнцыі па альтэрнатыўнай адукацыі.

СТАР. 5

ISSN 1990 - 763X

ПРА ЖЫЛЛЁ І НЕ ТОЛЬКІ

Работу будаўнічай галіны і павышэнне яе эфектыўнасці абмяркоўвалі на нарадзе ў Прэзідэнта Аляксандра Лукашэнкі. Але сустрэчу ён пачаў з абвяржэння плётак і растлумачыў, якія наступствы тояць забастоўкі на прадпрыемствах.

Калектывы — гэта аснова

«Я пакуль жывы і не за мяжой, як тут некаторыя нашы паважаныя «свядомыя» раскручваюць: «Прэзідэнт пакінуў краіну і знаходзіцца за мяжой», — паведаміў Прэзідэнт.

Размова адбылася на злобу дня, у зале прысутнічалі кіраўнікі асноўных будаўнічых арганізацый.

«Зараз пытаюцца расхістаць працоўныя калектывы, вы, напэўна, гэта добра ведаеце, добра адчуваеце. ***Працоўныя калектывы — гэта аснова нашай краіны.*** Вы маю пазіцыю ведалі і ведаеце, калі ў часы пандэміі я практычна забараніў звальняць людзей, выкідваючы іх на вуліцу. Цяжка, складана — але і зараз няпроста. Малайчыны будаўнікі, у іх прасцейшая сітуацыя, яны ўсе занятыя справай, але тым не менш спрабуюць і будаўнікоў там хіснуць», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

Ён нагадаў сваю адназначную пазіцыю: у цяжкія часы пандэміі нікога не прымушалі. Трымаць нікога не трэба і зараз.

«Калі людзі хочуць працаваць, калі ласка: вось работа, прыходзьце, працуйце. ***Калі чалавек не хоча працаваць, мы ж яго на ланцугу не зацягнем,*** таму ім проста — людзям, калектывам — трэба растлумачыць», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

У прыклад кіраўнік дзяржавы прывёў прадпрыемства «Беларускалій». Па словах Прэзідэнта, нават двухдзённая забастоўка прывядзе да таго, што галоўныя сусветныя канкурэнты ў гэтай сферы з Расіі і Канады «перахрысяцца і хуценька на рынак паставяць тое, што яны хочуць паставіць».

«Што да МТЗ, МАЗ і гэтак далей — богам просім: вы сёння не вырабіце дзесяць трактароў, не паставіце іх на рынак — заўтра немцы прыедуць з амерыканцамі, прывязуць сваю тэхніку, расіяне таксама перахрысцяцца. Толькі трэба разумець, што ***эканоміка сёння ў свеце толькі-толькі пачынае жывіць*** (яна ў пандэмію была спынена) і ўсе змагаюцца за гэтыя рынкі, каб уцюхаць нейкі трактар і іншае. ***Калі мы спынімся, мы ніколі не раскруцім сваю вытворчасць».*** — папярэдзіў Аляксандр Лукашэнка.

Па словах Прэзідэнта, сферу будаўніцтва дзяржава выцягнула з заняпаду, з'явіліся заказы, аб'ём работ, прырост вытворчасці.

Аптымізацыя нормаў і электрычнасць у кожны дом

Увесь комплекс задач па галіне падрабязна разгледзелі на рэспубліканскім семінары-нарадзе 23 лістапада 2018 года. Выпрацаваныя тады рашэнні і напрамкі павышэння эфектыўнасці галіны замацаваны ў дакументе самага высокага ўзроўню — Дырэктыве № 8.

Дакумент, падпісаны ў сакавіку мінулага года, утрымлівае задачы па ліквідацыі наяўных у галіне праблем, менавіта, — захавання нарматыўных тэрмінаў будаўніцтва аб'ектаў, у тым ліку жылых дамоў, падтрымання сярэдняга кошту квадратнага метра жылля з дзяржаўнай падтрымкай у памеры, які не перавышае сярэднямесячную заработную плату, зніжэння да аднаго года тэрміну накіравання шматдзетных сем'яў на будаўніцтва жылля.

Рашэнні, выкладзеныя ў Дырэктыве, павінны былі спрыяць развіццю гарадоў-спадарожнікаў, павелічэнню аб'ёмаў будаўніцтва арэнднага жылля, комплекснаму развіццю населеных пунктаў, павышэнню якасці і скарачэнню тэрмінаў падрыхтоўкі праектнай дакументацыі, павышэнню канкурэнтаздольнасці арганізацый будкомплексу на ўнутраным і знешніх рынках.

Прэзідэнт нагадаў, што «важнейшым прыярытэтам дзяржаўнай палітыкі ў галіны заўсёды з'яўлялася жыллёвае будаўніцтва».

Тут актуальныя пытанні, якія прагучалі на нарадзе: як рэгіёнамі вырашаецца задача па ліквідацыі чаргі сярод шматдзетных сем'яў, якія меры прыняты па развіцці рынку арэнднага жылля, павелічэнню долі дамоў, збудаваных за кошт сродкаў ведамстваў і прадпрыемстваў, што зроблена для таго, каб будаваць больш малапавярховага, індывідуальнага жылля?

«І неабходна ***не забываць шырэй выкарыстоўваць электрычнасць.*** Ужываць яе для ацяплення ў новых дамах. Абсталяваць іх электраплітамі. Мы, дарэчы, учора з энергетыкамі гэтае пытанне сур'ёзна разгледзелі, і там ёсць добрая прапанова па павелічэнні аб'ёмаў спажывання электрычнасці для жылля», — дадаў лідар краіны.

Аляксандр Лукашэнка нагадаў, што ў свой час правялі маштабную мадэрнізацыю прадпрыемстваў будаўнічага комплексу, куды былі ўкладзеныя вялікія бюджэтныя і банкаўскія рэсурсы.

«Нядаўна прынялі дадатковыя меры, накіраваныя на стабілізацыю работы гэтых прадпрыемстваў. Як выкананы гэтыя задачы, як яны выконваюцца? Ці вяртаюцца выдзеленыя сродкі?» — спытаў у прысутных Прэзідэнт.

Па словах кіраўніка краіны, ён неаднаразова ўзнімаў пытанне аб тым, што ў будаўнічай галіне ўсё занадта зарэгулявана. Нормы і правілы, якія прымяняюцца пры праектаванні, будаўніцтве і прыёмцы аб'ектаў у эксплуатацыю, з'яўляюцца залішнімі.

«Многія гэтыя нормы даўно маральна састарэлі і маюць патрэбу ў кардынальнай перапрацоўцы і аптымізацыі. Адпаведныя рашэнні былі прынятыя, ці змянілі мы гэтыя нормы, ці прыбралі залішнюю бюракратыю, ці паднялі гэтыя нормы, як у нас прынята казаць, да ўзроўню еўрапейскіх стандартаў. Што з гэтым пытаннем?» — працягнуў Аляксандр Лукашэнка.

У чэрвені 2019 года выдадзены ўказ, які прадугледжвае распрацоўку прынцыпова новых тэхнічных нарматыўных прававых актаў — будаўнічых нормаў і правілаў. Прэзідэнт запытаў, што зроблена ў гэтым кірунку.

Ён пацікавіўся таксама, як сёння ідуць справы на шкляных заводах, як выконваецца задача па іх загрузцы і мінімізацыі закупак шкляной тары за мяжой.

Марыя ДАДАЛКА, Варвара МАРОЗАВА.

У тэму

У Беларусі будзе створаны шкляны холдынг

Руслан ПАРХАМОВІЧ, міністр архітэктуры і будаўніцтва, выступаючы з дакладам, паведаміў, што прырост валавой дабаўленай вартасці па сектары за шэсць месяцаў года склаў 6 %. Забяспечана суаднясенне сярэдняга кошту аднаго квадратнага метра жылля і намінальнага сярэднямесячнага заробку на ўзроўні 0,86. Па словах міністра, сярэдні заробак будаўніка ў краіне — 1309 рублёў, тэмп росту ў параўнанні з мінулым годам — 115 %. Па выніках паўгоддзя ўведзена ў эксплуатацыю 1 мільён 774 тысячы «квадратаў» жылля.

Потым ужо ў размове з журналістамі ён дадаў, што абмеркаваны пытанні паэтапнага павелічэння будаўніцтва жылля на пяцігоддзе — і арэнднага, і для шматдзетных, і электаржылля.

Па словах міністра, амаль уступіла ў дзеянне іпатэка. Указ аб такім відзе крэдытавання быў прыняты ў красавіку, і ён уступае ў сілу пасля шасці месяцаў з дня апублікавання.

«Акрамя гэтага рыхтуецца ўказ па жыллёвых будаўнічых збераженнях. Вось-вось ён будзе ўнесены на разгляд. Тут цэлы комплекс нарматыўных дакументаў, якія ўжо прайшлі, і яшчэ шэраг дакументаў рыхтуецца да разгляду і прыняцця», — паведаміў Руслан Пархамовіч.

Ён заявіў, што на нарадзе былі разгледжаны пытанні па стварэнні будаўнічага шклянога холдынга. У найбліжэйшы час будзе праводзіцца актыўная работа па яго стварэнні.

Больш падрабязна пра гэта рассказаў **Юрый СКРЫПКО, генеральны дырэктар Гродзенскага шклозавода**: «Абмяркоўвалася пытанне аб стварэнні ў Беларусі шклянога холдынга. Ёсць станоўчыя прыклады і выдатны эфект ад аб'яднання».

На яго думку, галоўная карысць ад новай формы — аб'яданне кампетэнцый.

Некалькі гадоў таму Гродзенскі шклозавод быў аб'яднаны з такім жа прадпрыемствам у пасёлку Ялізава. «Здзелка была рэзананснай. Прайшло два гады, і ўсе задаволеныя, абмяняліся вопытам, сталі танней купляць сыравіну, лепш прадаваць сваю прадукцыю. Усё гэта дазволіла павысіць эфектыўнасць у разы», — звярнуў увагу Юрый Скрыпко.

Разгляд рашэння аб холдынгу ўжо на фінальнай стадыі, і ён будзе створаны, па словах гендырэктара, у найбліжэйшы час.

Гарады-спадарожнікі — піянеры

Кіраўніка дзяржавы праінфармавалі аб выкананні яго даручэнняў па актуалізацыі планаў гарадоў-спадарожнікаў Смалявіч, Рудзенска і Фаніпаля.

Як паведаміў журналістам **дырэктар БелНДІПгарадабудаўніцтва Аляксандр ХІЖНЯК**, адпаведныя праекты гатовыя да грамадскага абмеркавання, экспертыз, узгадненняў і прадстаўлення кіраўніку дзяржавы на зацвярджэнне. Генеральныя планы астатніх гарадоў-спадарожнікаў будуць актуалізаваныя ў наступным годзе.

«Размова ідзе аб тым, што развіваць трэба не толькі жыллёвае будаўніцтва, але і ствараць умовы, каб у людзей былі рабочыя месцы. У прыватнасці, Смалявічы знаходзяцца ў звязцы з індустрыяльным паркам «Вялікі камень» — натуральна, людзі будуць працаваць там. У Рудзенску развіваецца буйны інвестыцыйны праект БНБК, таму ў гэтым горадабудаўнічым праекце прынята рашэнне аб фарміраванні прамысловага парка «Рудзенск» на прылеглых тэрыторыях. У Фаніпалі актыўна будзе развівацца тэрыторыя Свабоднай эканамічнай зоны «Мінск» участак Фаніпаль», — праінфармаваў Аляксандр Хіжняк.

Гэтыя гарады — своеасаблівыя пілотныя праекты, працягнуў дырэктар прадпрыемства.

Акрамя таго, кіраўнік дзяржавы падтрымаў прапанову аб павышэнні статусу архітэктараў у Беларусі, аб умацаванні гэтай службы з наступным падпарадкаваннем Міністэрству архітэктуры і будаўніцтва.

«Развіваць гарады павінны прафесіяналы. У прыватнасці, у насельніцтва вялікая маса пытанняў па архітэктурным абліччы гарадоў, будаўніцтве: дзесьці будуем высотнае жыллё ў сядзібным, дзе гэта абсалютна дысануе з акаляючай забудовай, і гэтай далей», — растлумачыў ён неабходнасць удзелу кіраўніка дзяржавы ў развіцці айчыннай архітэктурнай службы.

АГУЛЬНАЯ МЭТА — МІР І ЗГОДА

Тое, што адбываецца ў краіне, абмеркавалі парламентарыі, праваахоўнікі і журналісты

У парламенце прайшла сустрэча дэпутатаў пяці пастаянных камісій, прадстаўнікоў Беларускага Хельсінкскага камітэта, Міжнароднай федэрацыі правоў чалавека, Беларускага саюза журналістаў і Беларускай асацыяцыі журналістаў. Яны абмеркавалі сітуацыю, якая складваецца ў Беларусі, і магчымыя шляхі яе вырашэння.

Старшыня Пастаяннай камісіі па правах чалавека, нацыянальных адносінах і СМІ Палаты прадстаўнікоў Генадзь ДАВЫДЗЬКА ў пачатку сустрэчы падкрэсліў, што яна не нясе пратакольнага характару.

«Гэта проста сустрэча зацікаўленых людзей, якія любяць сваю Радзіму, хочуць, каб у нас былі мір і згода ў грамадстве», — сказаў дэпутат.

«У нас вельмі шмат інфармацыі, у кожнага свой пункт гледжання. Але мы, я так думаю, аб'яднаны ў гэты момант на гэтай сустрэчы адной ідэяй: каб у нас быў мір. Мы павінны шчыра пагаварыць і, самае галоўнае, прапанаваць шляхі, што рабіць», — падкрэсліў парламентарый.

«Нас аб'ядноўвае жаданне нармалізаваць сітуацыю, каб у будучыню мы пайшлі незалежнай і суверэннай краінай», — адзначыў Генадзь Давыдзька.

Старшыня Беларускага Хельсінкскага камітэта Алег ГУЛАК выклаў дэпутатам, якім бачыцца становішча спраў праваабарончым арганізацыям. Ён падзякаваў за магчымасць абмеркаваць сітуацыю і пашкадаваў, што «такіх магчымасцяў, на жаль, было мала раней».

«Зараз вельмі шмат проблем з тым, што сістэмнае комплекснае ўспрыманне карціны ў многіх рознае. Праз гэта робяцца розныя высновы», — канстатаваў Алег Гулак.

Адказваючы на пытанні журналістаў, старшыня Беларускага Хельсінкскага камітэта падкрэсліў, што зараз вельмі важна стварыць умовы для дыялогу. У ліку першых крокаў, якія трэба зрабіць, ён назваў абавязковае вызваленне ўсіх затрыманых.

«Людзі павінны бачыць, што вызваляюць іх дзяцей, родных», — сказаў Алег Гулак.

«Мой галоўны заклік — усім быць мірнымі, каб усё заставалася ў мірных рамках, не звяртацца да гвалту», — рэзюмаваў ён.

Паводле БелТА.

ЧЫСТА ПА-ЧАЛАВЕЧЫ

Міністр унутраных спраў Юрый КАРАЕЎ у эфіры тэлеканала АНТ папрасіў прабачэння за траўмы выпадковых людзей на вулічных акцыях пратэсту

«Пры любой масавай сутычцы, пры спыненні групавых ці масавых парушэнняў грамадскага парадку атрымліваецца так, што ўздзейнічаюць на тых, хто адмыслова на гэта ішоў, і на тых, хто апынуўся побач, не сышоў своечасова, не здолеў адскочыць. Вось за гэтых людзей, тых, каму дасталася, я як камандзір хачу ўзяць на сябе адказнасць і папрасіць прабачэння чыста па-чалавечы перад гэтымі людзьмі», — сказаў Юрый Караеў.

Адказваючы на пытанне, ці могуць выпадковыя людзі стаць закладнікамі гэтай сітуацыі, міністр адзначыў, што так на самай справе і адбываецца. Пры гэтым ён лічыць, што ёсць сапраўды мірныя людзі, якія трапілі «пад раздачу», а ёсць тыя, хто маскіруецца пад мірнае насельніцтва.

Па словах Юрыя Караева, затрыманых мірных людзей павінны адпускаць як мага хутчэй, і гэта ўжо робіцца. «Я ўвогуле не крыважэрны чалавек і не хачу ніякага гвалту. Усё ж нашы грамадзяне. Ва ўсіх сем'і, дзеці», — сказаў Юрый Караеў.

Выказаўся ён і з нагоды затрымання журналістаў. «Я заўсёды супраць любога гвалту над журналістамі. Я таксама за тое, каб цывілізавана ўсё асвятлялася. Малайцы, адважна асвятляеце з самага эпіцэнтру падзеі. Для вас, вядома ж, вельмі важна як мага больш поўна, аб'ектыўна знутры аціраць інфармацыю. Але гэта не азначае, што трэба залезці паміж двума бакамі і падстаўляцца», — сказаў Юрый Караеў.

«Будзьце, калі ласка, не такімі легкадумнымі. Велізарная просьба не лезці ў самае пекла», — папрасіў міністр.

Пры гэтым ён адзначыў, што калі ў супрацоўніка праваахоўных органаў ляціць петарда, штосьці вострае, камень, брук і ён ужывае дзеянні ў адказ, то ён думае ў першую чаргу не пра тое, як яму не закрануць чалавека з камерай.

Юрый Караеў заявіў, што ён распарадзіўся адпускаць затрыманых журналістаў у першую чаргу.

У МУС АДКРЫВАЕЦЦА «ГАРАЧАЯ ЛІНІЯ» ДЛЯ ІНФАРМАВАННЯ ГРАМАДЗЯН

Яна будзе паведамляць пра месцазнаходжанне асоб, затрыманых за ўдзел у несанкцыянаваных мерапрыемствах, напісаў учора сайт міністэрства.

З 14.00 14 жніўня ў МУС Беларусі пачала працаваць «гарачая лінія», па тэлефонах якой можна даведацца пра месцазнаходжанне грамадзян, затрыманых за ўдзел у несанкцыянаваных масавых мерапрыемствах па краіне. Вы можаце пакінуць кантактную інфармацыю для зваротнай сувязі ў выпадку, калі грамадзяніна няма ў спісах.

Інфармацыю па абласных цэнтрах вы можаце даведацца ў УУС па тэлефонах:

- Тэлефоны для ўдакладнення інфармацыі па Мінску: (017) 218-73-92, (017) 218-73-40, (017) 239-43-84.
- Тэлефон для ўдакладнення інфармацыі па Брэсцкай вобласці: (0162) 20-55-87.
- Тэлефон для ўдакладнення інфармацыі па Віцебскай вобласці: (0212) 24-03-29.
- Тэлефон для ўдакладнення інфармацыі па Гомельскай вобласці: (0232) 96-74-47.
- Тэлефоны для ўдакладнення інфармацыі па Гродзенскай вобласці: (0152) 79-70-22, 102.
- Тэлефон для ўдакладнення інфармацыі па Магілёўскай вобласці: 102.
- Тэлефоны для ўдакладнення інфармацыі па Мінскай вобласці: (01795) 5-24-32, 102.

ПАЦЯРПЕЛЫХ ПАМЕНЕЛА, УРАЧОЎ ЗНАЙШЛІ

Міністэрства аховы здароўя адзначае памяншэнне колькасці пацярпелых, якія паступілі пры правядзенні вулічных акцый. Пра гэта ведамства паведамляе ў сваім Telegram-канале.

«За мінулыя суткі ў бальніцы не паступалі грамадзяне, пацярпелыя на масавых мерапрыемствах. У асноўным людзям з траўмамі была аказана медыцынская дапамога ў амбулаторных умовах. Так што на сённяшні дзень у бальніцах Беларусі знаходзяцца на шпіталізацыі 150 чалавек», — сказана ў паведамленні.

Міністэрства аховы здароўя ўзаемадзейнічае з медыцынскай службай МУС, каб выяўляць і пераводзіць пацярпелых грамадзян з месцаў часовага ўтрымання ў бальніцы.

«За мінулыя суткі з ЦІП на Акрэсціна пераведзена чатыры чалавекі, астатнія 50 агледжаны ўрачамі МУС. Усе яны знаходзяцца ў здавальняючым стане», — дадалі ў Міністэрстве аховы здароўя.

З Жодзіна ў лячэбныя ўстановы Мінскай вобласці пераведзена 13 грамадзян, шпіталізаваны шэсць, астатнім аказана амбулаторная дапамога.

Таксама Міністэрства аховы здароўя сумесна з МУС правяло работу па вышуку ў месцах часовага ўтрымання і вызваленні затрыманых работнікаў сістэмы аховы здароўя. Пра гэта БелТА паведамілі ў прэс-службе міністэрства.

«Усе яны, 16 чалавек, вызваленыя. Частка з нашых калег пачала працаваць», — расказалі ў прэс-службе.

Як адзначылі ў міністэрстве, на вечар учарашняга дня сярод затрыманых не было работнікаў сістэмы аховы здароўя. «У выпадку, калі ў грамадзян ёсць іншая інфармацыя — просім неадкладна паведаміць яе ў Міністэрства аховы здароўя», — сказалі ў ведамстве.

❍ Дарэчы

Міністэрства аховы здароўя абвергла інфармацыю, размешчаную ў сацыяльных сетках, пра крымінальны пераслед або звальненні медработнікаў, калі яны будуць удзельнічаць у акцыях салідарнасці, паведамляе БелТА.

«Сёння вечарам у сацыяльных сетках была распаўсюджаная інфармацыя, што супрацоўнікаў установы аховы здароўя чакае крымінальны пераслед або звальненне ў выпадку выступлення на акцыях салідарнасці. Тэкст размешчаны ў сацсетках са спасылкай на словы міністра і першага намесніка міністра. Афіцыйна заяўляем: гэтая інфармацыя не адпавядае рэчаіснасці», — адзначана ў паведамленні ведамства ў афіцыйным Telegram-канале.

Міністэрства аховы здароўя афіцыйна заяўляе, што «нікому з медыцынскіх работнікаў не забаронена выказваць сваю грамадзянскую пазіцыю ў непрацоўны час».

Пры гэтым Міністэрства аховы здароўя і Беларускі прафсаюз работнікаў аховы здароўя просяць не правакаваць парушэнне правапарадку і працоўнай дысцыпліны.

«На шчасце, акцыі, якія прайшлі сёння (14 жніўня. — **«Зв.»**) без якіх-небудзь эксцэсаў, не перашкодзілі нам завяршыць працэс вызвалення нашых супрацоўнікаў, затрыманых раней, бо любыя правакацыі маглі яго сарваць», — дадалі ў ведамстве.

НЯХАЙ УЛАГОДЗЯЦЦА СЭРЦЫ

Мітрапаліт Мінскі і Заслаўскі Павел, Патрыяршы Экзарх усяе Беларусі чарговы раз заклікаў беларусаў да стрыманасці і мудрасці

«Давайце зробім усё магчымае, каб мір запанаваў на нашай блаславёнай беларускай зямлі. Я заклікаю ўсіх да стрыманасці і мудрасці, — цытуе мітрапаліта БелТА. — Я звяртаюся сёння і да нашых святароў, таму што чую, як некаторыя з іх, выкарыстоўваючы інтэрнэт-рэсурсы, сацыяльныя сеткі, спрабуюць увайсці са сваім асабістым меркаваннем, разважаючы пра падзеі, што адбываюцца. Але ж у кожнага — сваё меркаванне. Нас заклікае Гасподзь не ўмешвацца ў палітычныя пытанні і справы. Палітыкай павінны займацца палітыкі, а мы, святары, павінны ўлагодзіваць сэрцы людзей».

Патрыяршы Экзарх усяе Беларусі таксама падкрэсліў, што хрэсныя хады не павінны выкарыстоўвацца ў палітычных мэтах. «Сёння, на жаль, падбухторшчыкі спрабуюць выкарыстаць нашы царкоўныя традыцыі, заклікаюць нас выходзіць на хрэсныя хады. Але калі яны дарэчныя, калі яны традыцыйныя, тады яны прынясуць карысць. А калі нас спрабуюць выкарыстаць у сваіх нейкіх палітычных мэтах, то гэтыя хрэсныя хады не на карысць паслужаць. Тых, хто хоча памаліцца, я ўсіх заклікаю прыходзіць у храмы і маліцца. Я веру і спадзяюся, што мір блаславёны запануе на нашай зямлі», — адзначыў ён.

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

У Японіі вельмі горача

Па меншай меры 14 чалавек памерлі ў Токіа за перыяд з 11 да 12 жніўня ад цеплавых удараў, паведамляе ТАСС.

Адзначаецца, што дзевяці загінулым было больш за 80 гадоў. Усяго за гэты жнівень ад спёкі памерлі 26 жыхароў японскай сталіцы.

13 жніўня галоўнае пажарнае ўпраўленне Японіі, якое выконвае функцыі МНС і хуткай дапамогі, паведаміла аб дзесяці загінулых і 6,6 тысячы пацярпелых ад цеплавых удараў у краіне за перыяд з 3 да 9 жніўня. У сувязі з гэтым японскія ўлады папярэдзілі грамадзян аб неабходнасці старанна сачыць за самаадчуваннем у гарачыя дні і заклікалі піць пабольш вадкасці.

Бягучы тыдзень стаў самым гарачым у Японіі гэтым летам. У шэрагу раёнаў слупок тэрмометра падымаўся на працягу дня вышэй за 38 градусаў, а ў прэфектуры Гума 11 жніўня днём паветра прагрэлася да 40,1 градуса.

Перыяд найбольш гарачага надвор'я ў Японіі прыпадае на ліпень-жнівень, аднак ужо другі год запар у ліпені было больш пахмурных і дажджлівых дзён. У 2019 годзе па ўсёй краіне ад спёкі загінулі 126 чалавек, больш за 70 тысяч пацярпелі.

У Кітаі апоўзень разбурыў чыгунку

Моцны дождж 13 жніўня справакаваў апоўзень, прымусіўшы ўлады прыпыніць работу ўчастка чыгункі ў правінцыі Юньнань на паўднёвым захадзе Кітая, паведамляе Сіньхуа.

Куньмінская група Кітайскай чыгуначнай карпарацыі /China Railway/ заявіла, што апоўзень абрынуўся на станцыю Лахадзі на чыгунцы Куньміна-Хэкоу каля 03.20 раніцы, затапіўшы некаторыя з цягнікоў на станцыі і парушыўшы чыгуначныя зносіны.

Усе супрацоўнікі станцыі і іх сем'і эвакуіраваны, работа на ўчастку чыгункі прыпыненая. Кампанія мабілізавала рабочых на рамонт чыгункі.

У Іспаніі забаранілі курыць на вуліцы

Улады Іспаніі вырашылі прыняць дадатковыя меры для стрымлівання распаўсюджвання COVID-19. Пра гэта заявіў міністр аховы здароўя каралеўства Сальвадор Ілля, паведамляе ТАСС.

«Мы вырашылі прыняць скаардынаваныя дзеянні, — сказаў кіраўнік ведамства. — Пастанаўляецца закрыццё дыскатэк, начных бараў». Акрамя таго, паводле яго слоў, кафэ і рэстараны павінны зачыняцца не пазней 01.00 па мясцовым часе. Сальвадор Ілля заявіў, што ў рамках мер барацьбы з пандэміяй вырашана забараніць ужываць алкагольныя напоі на вуліцы. Міністр расказаў таксама, што ўведзена забарона на курэнне на вуліцы і ў іншых грамадскіх месцах, калі няма магчымасці захоўваць дыстанцыю два метры. Спачатку гэтыя меры датычыліся толькі Галісіі і Канарскіх астравоў, але 14 жніўня забарона была распаўсюджана на ўсю тэрыторыю Іспаніі, расказвае іспанская газета Marca.

Праблемы і рашэнні

МАЛЫ І СЯРЭДНІ БІЗНЕС — ЛАКАМАТЫЎ ЭКАНОМІКІ

Што перашкаджае яго руху?

Старшыня Мінскага аблвыканкама Аляксандр ТУРЧЫН сустрэўся з прадстаўнікамі бізнес-супольнасці Мінскай вобласці.

Губернатар канстатаваў, што летась унёсак малога і сярэдняга бізнесу ў валавы рэгіянальны прадукт Міншчыны склаў 36 %, а сёлета доля падатковых паступленняў дасягнула 40 %. Ён нагадаў, што пастаўлена задача ў будучай пяцігодцы павысіць заработную плату. Менавіта ад яе ўзроўню залежыць дабрабыт грамадзян. Але для гэтага неабходна стварыць канкурэнтныя ўмовы. Разам з тым без эфектыўнай работы ўсіх галін эканомікі павысіць заробкі жыхароў Міншчыны немагчыма. Таму Аляксандр Турчын заклікаў удзельнікаў сустрэчы, а гэта кіраўнікі і заснавальнікі суб'ектаў гаспадарання, агучыць тыя праблемы, што іх хвалююць, абмеркаваць шляхі іх вырашэння для таго, каб ведаць, як і куды рухацца. Ён пацікавіўся, якая дапамога, падтрымка неабходная прадпрымальнікам з боку аблвыканкама, урада, дзяржавы.

Частка паўнамоцтваў — Саветам дэпутатаў

— Мы як прадстаўнікі транспартнай сферы першыя сутыкнуліся з праблемамі, звязанымі з пандэміяй каранавіруса, — падзяліўся з прысутнымі **заснавальнік таварыства з абмежаванай адказнасцю «Інтэртрансаўта» з Дзяржынскага раёна Андрэй СМОЛЯР.** — Закрыліся граніцы з галоўнымі транзітнымі краінамі — Польшчай, Расіяй, скараціўся аб'ём грузаперавозак. Але ў любым крызісе самае галоўнае — не паддавацца паніцы. Мы сабралі калектыў, растлумачылі сітуацыю ў свеце, на прадпрыемстве і пайшлі на такія меры, як зніжэнне заработнай платы і сабекошту тэхнікі на 15-20 працэнтаў. Мы абзванілі сваіх партнёраў і атрымалі доўгатэрміновыя кантракты. Дзякуючы гэтым дзеянням удалося пазбегнуць скарачэння работнікаў і спынення дзейнасці прадпрыемства. А ўжо з першага ліпеня мы вярнулі даходы на ранейшы ўзровень.

Андрэй Антонавіч лічыць, што для бізнесу вельмі важнае такое пытанне, як купля або доўгатэрміновая арэнда вытворчых будынкаў, памяшканняў. Не можа адчуваць сябе спакойна і плённа працаваць прадпрымальнік, які атрымаў нерухомасць у арэнду на непрацяглы час. «Мы хацелі набыць участак у 1,5 гектара, на якім раней месцілася прадпрыемства. Ды гэта была абласная ўласнасць, за якую нам выставілі цану 300—500 тысяч долараў. Асфальт на гэтай тэрыторыі прыйшоў у непрыгоднасць, будынкі практычна разваліліся. Іх прасцей было знесці, чым рамантаваць. А гэта яшчэ 100—200 тысяч долараў дадаткова», — расказаў Андрэй Смоляр. Кіраўнік выказаў прапанову, што ў такіх сітуацыях трэба даваць шырэйшыя паўнамоцтвы мясцовым уладам, каб яны маглі самастойна прымаць рашэнні па пэўных пытаннях.

— Мы аддалі частку паўнамоцтваў Мінскаму абласному Савету дэпутатаў. Гэтыя пытанні — прэрагатыва раённых Саветаў дэпутатаў, якія практычна распараджаюцца сваёй уласнасцю. Калі яны прынялі рашэнне (а дэпутаты прагаласавалі за яго), каб аддаць зямлю, нявыкарыстаную маёмасць бясплатна або за адну базавую велічыню, то гэта не павінна падвяргацца сумненню, — канстатаваў губернатар. — Гэта датычыцца не толькі абласной, але і рэспубліканскай уласнасці. На месцах лепш ведаюць прадпрымальнікаў, іх магчымасці. Калі год-другі мы не прымаем рашэнне па нейкім пытанні, у інвестара знікае жаданне займацца тым ці іншым бізнесам.

Аляксандр Турчын прывёў прыклад з Любанскага раёна. Прадпрымальнік давёў да ладу пусты будынак сталоўкі і адкрыў там кавярню. Але не захаваў фармальнасці — замест заяўленых 20 новых рабочых месцаў стварыў 18. Дэпутаты вырашылі прадоўжыць яму тэрміны выканання. Але абласны камітэт дзяржкантролю абавязаў яго ўсё вярнуць раёну, бо не былі выкананы ўмовы дагавора. «Я напісаў ліст Леаніду Анфімаву (былы старшыня Дзяржкантролю), дзе паведаміў, што ёсць рашэнне раённага Савета дэпутатаў, якое ён падтрымаў», — адзначыў Аляксандр Турчын.

Са стратнымі прадпрыемствамі развітвацца

Заснавальнік таварыства з абмежаванай адказнасцю «Амантыс-Мед» з Лагойскага раёна Уладзімір Адамовіч па сваім раёне бачыць, што прыватныя прадпрыемствы працуюць эфектыўней, чым дзяржаўныя. На яго думку, у дзяржаўных для гэтага недастаткова стымулу. Прыватная ўласнасць больш прадукцыйная, прагрэсіўная.

— Для мяне галоўнае пытанне — эфектыўнасць прадпрыемства: не важна, якой яно формы ўласнасці, — рэзюмаваў губернатар. — «Беларускалій», БелАЗ павінны заставацца ў дзяржаўнай уласнасці. Я не разумею, для чаго іх прадаваць, з якой мэтай? Каб потым канкурэнты іх прыкрылі? Што датычыцца сярэдніх і малых дзяржаўных прадпрыемстваў, якія стратна працуюць на працягу шэрагу гадоў, то з імі трэба спакойна развітвацца. І Мінская вобласць — прыклад таго, як многія суб'екты гаспадарання сталі прыватнымі і эфектыўнымі.

Стымулы для кіраўнікоў гаспадарак

Удзельнікі сустрэчы закранулі і тэму заработнай платы кіраўнікоў сельгасарганізацый. На іх думку, патрэбны матэрыяльныя стымулы, каб тыя мелі матывацыю і інтарэс вывесці гаспадаркі на вышэйшы ўзровень развіцця.

Бясспрэчна, без кіраўніка нічога немагчыма зрабіць, пагадзіўся з прысутнымі Аляксандр Турчын. Цяпер зарплата кіраўніку даецца адпаведна каэфіцыенту суадносін сярэдняй заработнай платы на прадпрыемстве. Чым яна вышэйшая, тым большы будзе каэфіцыент. Затым можна ўвесці сістэму бонусаў у залежнасці ад прыбытку. Пасля гэтага на чарзе — удзел у акцыянерным капітале. Напрыклад, можна выдзеліць 25 % акцый.

Знізіць працэнтныя стаўкі па крэдытах

Праблему высокіх крэдытных ставак закрануў дырэктар таварыства з абмежаванай адказнасцю «Завод металаканструкцый «Эталон» Барысаўскага раёна Сяргей Кот. Ён нагадаў, што павялічыць заробкі магчыма за кошт павышэння прадукцыйнасці працы. А для гэтага прадпрыемствам неабходны новыя сучасныя тэхналогіі, абсталяванне. Ды набыць яго практычна немагчыма з прычыны высокіх крэдытных працэнтных ставак. У беларускіх рублях яны складаюць пад 14 %, у валюце да 6 %.

Акрамя таго, банкі выдзяляюць крэдыты для будаўніцтва новых памяшканняў пад залог, які дасягае двух мільёнаў долараў. Дзе іх узяць?

Сяргей Кот прапанаваў выдзяляць крэдытныя рэсурсы пад залог існуючых плошчаў і нерухомасці. Банкі маглі б выдаваць крэдыты для ўзвядзення новых памяшканняў са стаўкай да 1 %. У гэтым выпадку прадпрыемствы змогуць іх хутка вярнуць.

— Выгадней будавацца за валютныя крэдыты, бо беларускі рубель трэба канвертаваць на біржы, што цягне за сабой не зусім добрыя наступствы. Што датычыцца крэдытавання пад будаўніцтва памяшканняў, у найбліжэйшы час будзем абмяркоўваць гэтае пытанне з прэм'ер-міністрам або Прэзідэнтам, — запэўніў Аляксандр Турчын.

Агучылі ўдзельнікі сустрэчы і шмат іншых праблем. Яны будуць вывучаны, прааналізаваны, сістэматызаваны для прыняцця адпаведных рашэнняў.

Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.

Добрая навіна

У «МАГІЛЁЎСАЮЗДРУКУ» — НОВЫ ФАРМАТ

Калісьці ў Магілёве на вуліцы Болдзіна працавала вельмі папулярная крама ад ААТ «Магілёўсаюздрук», і было шкада, калі яна пераехала. І вось нарэшце магазін вярнуўся, прычым пад нумарам 1 і з інтрыгуючай назвай — «Першая паласа».

— Вельмі шмат было пажаданняў, каб мы адкрылі тут сваю краму, — кажа яе **загадчыца Наталля ФРЫГІНА.** — І зараз людзі нам удзячныя за гэта.

Крама на Болдзіна сапраўды ўтульная. Прывабнасці ёй дадае дызайн у беларускім стылі. На палічках шырокі выбар перыядычных выданняў, шмат літаратуры на роднай мове — усё знаходзіцца ў вольным доступе, можна ўзяць у рукі, пагартаць. Акрамя гэтага, вялікі выбар канцтавараў, сувенірнай прадукцыі, бакалейных тавараў.

— «Першая паласа» — гэта наша першая ластаўка, плануем стварыць сетку крам пад такой назвай, — кажа **дырэктар ААТ «Магілёўсаюздрук» Алена КОТАВА.** —Трэба адпавядаць сучаснасці і імкнуцца абслугоўваць пакупніка прыгожа і цывілізавана. Тыя ж кіёскі — гэта ўчарашні дзень. Пакупніка такое больш не задавальняе. Працаваць з кіёскам не вельмі зручна, а ў спажыўца няма магчымасці ацаніць належным чынам тавар. Іншая справа — павільён: тут спажыўцы выбіраюць тавар самастойна, могуць нават выпіць кавы. У будучым хацелася б замяніць кіёскі павільёнамі.

Нэлі ЗІГУЛЯ, фота аўтара.

БЕЗ ПАМЫЛАК НЕЛЬГА РУХАЦЦА НАПЕРАД

ПОШУК АЛЬТЭРНАТЫВЫ

— Я лічу, што ў нашай краіне права рэалізоўваць гуманнае навучанне дзяцей у тым фармаце, які мы, бацькі, лічым патрэбным, — абмежаванае, — разважае **арганізатар і настаўнік сямейных класаў Любоў БАРКУН.** — Адзіная магчымасць — гэта арганізаваць дзіцяці навучанне па індывідуальным плане, але аднаго толькі жадання перайсці на сямейнае выхаванне будзе недастаткова. Ёсць пэўны пералік прычын, па якіх гэта магчыма зрабіць, прычым яны павінны быць вельмі важкія. Табе могуць проста адмовіць, таму трэба быць настойлівым. У выніку, на мой погляд, сям'я ў нас не можа выступаць паўнавартасным заказчыкам адукацыі.

«Дазваляйце памыляцца сабе і сваім дзецям, быць неідэальнымі! Гэта не проста патрэбна, а яшчэ карысна і цікава».

— Калі няма даверу да школы, то ты пачынаеш шукаць нейкія альтэрнатыўныя спосабы, — канстатуе **заснавальнік і дырэктар адукацыйнага цэнтра Astra Global, блогер, маці дзяцей, якія навучаюцца дома, Наталля БОГДАН.** — Мы аддалі дачку ў першы клас звычайнай школы, але яна хадзіла туды са слязамі. Я чула, як з ёй там размаўляюць, — з такімі інтанацыямі і такім стаўленнем яна дома ніколі не сустракалася, і для яе гэта быў магутны стрэс. Таму нам давялося яе адтуль забраць. Я ўпэўнена, што школа павінна забяспечыць не толькі пэўны ўзровень адукацыі, але і спрыяльную псіхалагічную атмасферу, бо нясе адказнасць і за псіхічны стан дзяцей у тым ліку. Цяпер я ўзяла адказнасць за навучанне сваіх дзяцей на сябе: гэта вялікая нагрузка па пошуку педагогаў, з якімі ў дзяцей будзе паразуменне ды добры кантакт, па матывацыі іх да навучання. Я хачу, каб дзецям было цікава вучыцца, а школе ўласцівая канцэнтрацыя на другасных і нейкіх знешніх крытэрыях: там важна, як афармлена твая работа, колькі клетачак ты адступіў. Трэба ўлічваць, у якім свеце мы жывём. Можа, уменне друкаваць на камп'ютары сёння важнейшае, чым уменне пісаць прыгожым почыркам?

ПАД БАЦЬКОЎСКІМ ПРЭСІНГАМ

— З глабальнага пункту погляду заказчыкам павінна быць усё ж такі дзяржава, але яна павінна быць заказчыкам і прыватнай адукацыі ў тым ліку, заахвочваць разнастайнасць, любыя формы адукацыі, уключаючы і хатняе навучанне, — падкрэслівае **выкладчык англійскай і французскай моў, заснавальнік дзвюх моўных школ, член Грамадскага кансультацыйнага савета пры Міністэрстве адукацыі Андрэй ГРЫГОР'ЕЎ.** — І ў школе павінна быць добра арганізаваная прафарыентацыйная работа, прычым яна павінна весціся з пятага да дзявятага класа, каб два апошнія школьныя гады падлетак мог прысвяціць таму, што яму насамрэч па душы і чым ён хоча далей займацца. Напрыклад, у Англіі дзецям даюць магчымасць прыслухацца да сябе, і бацькі там у выбар сваіх дзяцей не ўмешваюцца. А ў нас назіраецца зусім іншая сітуацыя — дзеці выбіраюць прафесію пад ціскам дарослых, а потым прыносяць ім дыплом і кажуць: «Ты хацеў — дык атрымай». Віна бацькоў у тым, што яны самі вельмі часта тармозяць сваіх дзяцей у іх памкненнях. Таму ў нас зусім не рэдкасць, калі адзінаццацікласнікі не ведаюць, у якой прафесіі яны сябе бачаць. Ты хочаш быць музыкантам, але бацькі кажуць: «Спачатку атрымай нармальную адукацыю, якая цябе пракорміць. Ідзі папрацуй, напрыклад, бухгалтарам...»

— А пачынаецца ўсё прыкладна з паўтара гадоў, калі маці пытаецца ў дзіцяці: «А якую ты хочаш кашу? Аўсяную? А я ўжо гатую табе рысавую...» Потым у прыёмнай камісіі ВНУ абітурыенту працягваюць бланк для запаўнення, а маці яго выхоплівае і кажа: «Дай я сама запоўню, а то ты ўсё сапсуеш». І вось пад такім бацькоўскім прэсінгам даволі цяжка самавызначацца, — кажа **сузаснавальнік прыватнай установы адукацыі — сярэдняй школы LuCh, Акадэміі крэатыўных тэхналогій для дзяўчат IT Princess, дырэктар Асацыяцыі «Адукацыя для будучыні» Валянціна ЧЭКАН.** — У многіх бацькоў дзейнічае ўстаноўка кшталту: калі я не датанцавала, то ты датанцуеш, калі я не здзейсніў сваю мару, яе здзейсніш ты. Дзіця не павінна рэалізоўваць нашы амбіцыі. Нельга навязваць яму прафесію, густы, ацэнкі, а трэба даць прайсці свой шлях і пражыць сваё жыццё.

І цікаўнасць узнікае толькі тады, калі ёсць свабода выбару і свабода самавыяўлення. Да мяне прыводзяць дзяўчыну і кажуць: «Ёй 15 гадоў, і яна нічога не хоча. Валянціна, ну зрабіце што-небудзь, каб яна захацела...» Я ў яе пытаюся: «Што ты хочаш?» Адказвае: «Хачу маляваць». — «А маці што хоча?» — «Каб я стала юрыстам».

«Мы павінны спаборнічаць самі з сабой, рухацца наперад праз інтарэс, а не праз міжасобасную канкурэнцыю».

Мяркую, што нельга аспрэчваць права бацькоў быць заказчыкамі адукацыі. Праўда, у мяне напрошваецца аналогія. Калі нам аказалі няякасную паслугу ці зрабілі гэта нясвоечасова, мы ж не маўчым, ведаем, куды можна паскардзіцца. А што адбываецца ў адукацыі? Ці насамрэч яна ў нас бясплатная? Напрыклад, я як маці дачкі што навучалася ў дзяржаўнай школе, лічу, што ў бацькоў ёсць два шляхі. Па-першае, ты павінен максімальна ўнікаць у тое, што адбываецца з тваім дзіцем у школе, а па-другое, патрабуецца пэўная бацькоўская смеласць, каб у выпадку неабходнасці сваё дзіця абараніць. Мы вельмі многія паслугі аплачваем двойчы. Спачатку са сваіх падаткаў, а потым яшчэ раз са сваёй кішэні.

Калі мая дачка вывучае за ўласныя грошы інтэрнэт-маркетынг тры гады без наяўнасці інтэрнэту ў вучэбнай аўдыторыі, то ці атрымаю я таго спецыяліста, які мне патрэбны на выхадзе? За што я плачу? Калісьці даведалася, што ў Аўстраліі грамадзяне атрымліваюць напрыканцы года доўгі чэк-справаздачу пра тое, куды былі накіраваныя іх падаткі. Напрыклад, за іх заасфальтавалі 20 метраў дарогі побач з гіпермаркетам, набылі 48 кніг у бібліятэку і гэтак далей. Мне таксама хацелася б ведаць: а куды ідуць мае падаткі? Можа, лепш мне яшчэ з моманту нараджэння дзіцяці іх адкладваць у скарбонку, бо потым усё роўна давядзецца плаціць за адукацыю?

ЗАБЯСПЕЧЫЦЬ РАЗНАСТАЙНАСЦЬ

— Асабіста я з боку бацькоўскай супольнасці не бачу адукацыйнага заказу, — канстатуе **прыватны настаўнік матэматыкі, кансультант па пытаннях адукацыі Ягор ДАЎГАЛЕВЕЦ.** — Напрыклад, калі да мяне звяртаюцца як да прыватнага настаўніка або ў рамках нейкіх школьных праектаў, то звычайна пытаюцца: «Колькі каштуе? Калі вы працуеце? І дзе вы знаходзіцеся?» Але ніхто не пытаецца: «Чым вы адрозніваецеся, што вы нам можаце прапанаваць?» Усе пытанні звычайна зводзяцца да грашовага складніка.

Мне сучасныя дзеці надзвычай цікавыя, таму што яны жывыя і вельмі сапраўдныя. І ў іх ёсць матывацыя, але тое, што прапануе наша сістэма адукацыі, ім зусім нецікавае. На мой погляд, наша Міністэрства адукацыі павінна адказваць толькі за верхні ўзровень: за кааперацыю, сусветную камунікацыю, за пошук і аналіз усяго новага, што з'яўляецца на сусветным адукацыйным рынку, яго адаптацыю пад нашы рэаліі, накіраванне педагогаў на міжнародныя канферэнцыі. Міністэрства павінна дапамагаць зрабіць сістэму адукацыі разнастайнай, каб былі розныя формы і выбар школ. У кожнай будзе свая ўнікальная прапанова, каб бацькі насамрэч маглі выбіраць. А вось ствараць разнастайнасць — гэта ўжо зона нашай з вамі адказнасці.

— Па маіх назіраннях, прапанова з боку адукатараў сёння апярэджвае попыт з боку бацькоў. Мы вывучаем розныя сусветныя трэнды, імкнёмся ад іх не адставаць. Я рэалізую розныя адукацыйныя праекты і сутыкаюся з тым, што апошнія пяць гадоў да нас прыходзяць бацькі, якія абсалютна не маюць уяўлення пра тое, а што ж яны чакаюць ад адукацыі. Суцэльны белы аркуш па гэтай тэме. І калі я запрашу бацькоў на Дзень адчыненых дзвярэй, каб паназіраць бліжэй з адукацыйнай канцэпцыяй маёй школы, то энтузіязму з іх боку дакладна не сустрэну, — кажа Валянціна Чэкан. — І мушу заўважыць, што прыватная адукацыя не заўсёды азначае якасць. Гэта можа быць проста гісторыя пра грошы. У школе могуць добра карміць, там ёсць басейн, у класе сядзіць значна менш вучняў, дзецям выкладаюцца некалькі замежных моў, але адукацыйнай канцэпцыі ў гэтай установы адукацыі няма.

ТРЭБА СПРАБАВАЦЬ УСЁ

— Кожнае дзіця з нараджэння матываванае на развіццё, на спазнанне свету, таму вельмі важна яго ў гэтым падтрымаць, — разважае **псіхолаг, маці чатырох дзяцей, кіраўнік адукацыйнага клуба гуманнай педагогікі «Разумная сямейка» Алеся ТАЛПЕКА-МАХАТАЕВА.** — Я падзяляю думку Шалвы Аманашвілі, які кажа, што трэба зрабіць усё, каб дзіцяці не хацелася «вісець» на дошцы гонару ў школе, не было жадання выдзеліцца і ўзвысіцца над іншымі за кошт сваіх адзнак. Гэта ў прынцыпе не вельмі ўдалы стымул для жыцця. Мы павінны спаборнічаць самі з сабой, рухацца наперад праз інтарэс, а не праз міжасобасную канкурэнцыю. «Ваша дзіця нічога на ўроку не хоча рабіць. Разбярыцеся», — кажа настаўнік бацькам. Прабачце, але ці іх гэта праблема? Ці ўсё ж такі зацікавіць, захапіць сваім прадметам — гэта задача настаўніка? Звычайна педагогі ідуць да вучняў са сваім прадметам у руках, а трэба разам з вучнямі ісці да прадмета.

— Калі да мяне прыходзяць бацькі са скаргай на страту матывацыі і пытаннем, як яе вярнуць, я разумею, што размова ідзе зусім не пра матывацыю. Проста дзіця вымушана рабіць у школе тое, што яму нецікава, і, як яно думае, не патрэбна. Сапраўдная матывацыя ў яго можа прарывацца ў выглядзе адмовы ад таго, што мы яму навязваем, і гэта праяўляецца ў бунце, — звяртае ўвагу бацькоў **псіхолаг Вераніка МІХАЛКА.**

— Каб зразумець, што я хачу, трэба спрабаваць усё. Інакш адкуль ты можаш даведацца, што табе падабаецца хімія, калі ты ёй не займаўся? — дадае **псіхолаг Зоя НАВАРА.** — Думаю, праблема ў тым, што ў школе ты проста не можаш адмовіцца ад таго, што табе нецікава. Дарэчы, матывацыя ад маці кшталту «я буду табой ганарыцца» таксама можа працаваць некаторы час. Але патрэбная не толькі знешняя, але і ўнутраная матывацыя. Словы «табе гэта ў жыцці спатрэбіцца» не працуюць: час ідзе, а аб'ём незапатрабаваных ведаў павялічваецца. Такое адтэрмінаванае чаканне цягне за сабой развіццё неўрозу. А аргументы кшталту «я лепш ведаю, ты павінен слухаць мяне, таму што я старэйшая» і ўвогуле не працуюць.

— А яшчэ матывацыя дзіцяці можа ўвогуле не перасякацца са школьнымі дысцыплінамі, — кажа **настаўнік фізікі і інфарматыкі, STEM-педагог Аксана АКУНЕВІЧ.** — Мне вельмі імпануе, што ў беларускіх школах укараняецца тэхналогія актыўнай ацэнкі, калі дзіця параўноўваюць не з іншымі, а з самім сабой, вучань ставіць мэты і рушыць да іх. І зваротная сувязь, якую забяспечвае настаўнік, — гэта не інструмент пакарання. Але ў нашым грамадстве, на жаль, пакуль пануе культ адзнакі.

— Школьныя адзнакі ўключаюць не толькі ацэнку ведаў, але і ацэнку тваёй асобы. Вось ці хацелі б мы, дарослыя, каб нас ацэньвалі без нашага запыту? А дзяцей у школе ацэньваюць штодня: табе — «васьмёрка», а табе — «пяцёрка». І нават пахвала — гэта таксама інструмент ацэньвання, — кажа Вераніка Міхалка. — І ёсць страх, што наступным разам ты можаш аказацца недастойны пахвалы. А што, калі мы перафарматуем ацэньванне дзяцей пад іх запыт? Я разумею, што гэта рэвалюцыйны падыход, але чаму б і не?

— Усе мы баімся памыляцца: і дарослыя, і дзеці. І з гэтым трэба штосьці рабіць, — падкрэслівае Зоя Навара. — Дазваляйце памыляцца сабе і сваім дзецям, быць неідэальнымі! Гэта не проста патрэбна, а яшчэ карысна і цікава.

— Без памылак нельга рухацца наперад. А спатыкнуцца можна і на роўнай дарозе, — дапаўняе Алеся Талпека-Махатаева.

Надзея НІКАЛАЕВА.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Жлобинский механический завод «Днепр» (продавец) в лице ликвидатора ОАО «Жлобинский механический завод «Днепр» – директора ООО «Модель антикризисного управления» Куценковой Н. С., извещает о проведении 28 августа 2020 года открытого повторного аукциона со снижением цены на 30 % по продаже имущества в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20

№ лота	Наименование предметов торгов	Начальная цена продажи имущества с учетом НДС (20 %), бел. руб.	Сумма задатка, с учетом НДС (20 %), бел. руб.
	Условие продажи: 1. Победитель (единственный участник) аукционных торгов самостоятельно и за свой счет проводит демонтаж, погрузку, транспортировку приобретенного на аукционе имущества. В случае нарушения целостности имущества Продавца при демонтаже и погрузке приобретенного имущества на Покупателя возлагается обязанность по приведению поврежденного имущества в первоначальное состояние. 2. Действия по снятию с регистрационного учета транспортных средств (автотехники и механизмов), а также в случае необходимости получения регистрационных документов (при их отсутствии у Продавца), производятся Покупателем на основании выданной доверенности Продавцом, за его счет и его силами. Переоформление документов на автотехнику и механизмы производится за счет покупателя. **Местонахождение лотов:** Гомельская обл., Жлобинский р-н, г. Жлобин, ул. Школьная, д. 8		
1	Благоустройство территории Жлобинского РМЗ (перед входом), тротуарная плитка (131,0 кв. м), железобетонное ограждение (52,0 м. п.), цветочница (фонтан) к зданию столовой на 84 посадочных мест (инв. № 320/С-13341)	**1 652,85**	165,29
2	Цифровая инженерная система ОСЕ, инв. № 61398	**12 950,00**	1 295,00
3	Станок полуавтомат 2Е-440А, инв. № 50295	**1 890,00**	189,00
4	Станок токарный 16К25, инв. № 60338	**6 790,00**	679,00
5	Станок токарно-винторезный ГС-526У-01, инв. № 60479	**14 490,00**	1 449,00
6	Станок токарно-винторезный ГС-526У-02, инв. № 60791	**47 530,00**	4 753,00
7	Лазерный принтер HP LaserJet Pro 400MFP, инв. № 61321	**77,00**	7,70
8	Емкости металлические для ГСМ шт. 6 (25 куб. м – 1шт., 11 куб. м – 1 шт., 3 куб. м – 4 шт.), инв. № 60444	**1 260,00**	126,00
9	Вертикальный консольно-фрезерный станок со столом FSS450R, инв. № 60459	**31 780,00**	3 178,00
10	Аппарат копировальный многофункциональный KYOGERA KM-3650W (эра), инв. № 60882	**1 470,00**	147,00
11	Вальцы ИБ 2222, инв. № 133	**3 990,00**	399,00
12	Станок токарно-карусельный 1541, инв. № 134	**17 990,00**	1 799,00
13	Телевизор Горизонт 32 LCD, инв. № 60879	**112,00**	11,20
14	Вальцы для гибки двутавра, инв. № 50602	**9 870,00**	987,00
15	Вальцы И-2220Б, инв. № 40	**6 090,00**	609,00
16	Рольганг для станка правки грибовидности, инв. № 61414	**1 610,00**	161,00
17	Рольганг для станка правки грибовидности, инв. № 61413	**1 610,00**	161,00
18	Трактор сварочный MZ1000, инв. № 60411, 60412	**5 320,00**	532,00
19	Станок радиально-сверлильный ОС 2833, инв. № 50352	**6 230,00**	623,00
20	Комплект сварочного полуавтомат Варио Синержик 5000-2 ZA-Евро, инв. № 60808	**1 120,00**	112,00
21	Полуавтомат сварочный Origo Mig 502c, инв. № 61214	**5 600,00**	560,00
22	Сварочный трактор RILON, инв. № 61395	**4 130,00**	413,00
23	Установка аргон-дуг. УДГУ-351 АС/ДС, инв. № 60499	**1 190,00**	119,00
24	Аппарат воздушно-плазменной резки CUT100, инв. № 61186	**840,00**	84,00
25	Станок радиально-сверлильный 2К550, инв. № 60960	**4 830,00**	483,00
26	Станок радиально-сверлильный ГС545, инв. № 60661	**16 030,00**	1 603,00
27	Станок радиально-сверлильный ГС545, инв. № 61145	**18 690,00**	1 869,00
28	Плита монтажная 1.5*3000, инв. № 60944	**11 410,00**	1 141,00
29	Плита монтажная 1.5*3000, инв. № 60945	**11 410,00**	1 141,00
30	Плита монтажная 1.5*3000, инв. № 60946	**11 410,00**	1 141,00
31	Плита монтажная 1.5*3000, инв. № 60947	**11 410,00**	1 141,00
32	Плита монтажная 1.5*3000, инв. № 60948	**11 410,00**	1 141,00
33	Установка правки двутавровых балок JZJ-800, инв. № 61408	**18 480,00**	1 848,00
34	Установка для сборки балок HZJ -1800, инв. № 61312	**79 800,00**	7 980,00
35	Механизм подачи PDE-41W, инв. № 60787	**1 120,00**	112,00
36	Сварочный аппарат HUGONG THMIG-500 в к-те, инв. № 60820	**1 120,00**	112,00
37	Кондиционер G12LHP, инв. № 60969	**350,00**	35,00
38	Кондиционер G12LHP, инв. № 60970	**350,00**	35,00
39	Кондиционер G12LHP, инв. № 60971	**350,00**	35,00
40	Кондиционер LG S18LHP, инв. № 60975	**490,00**	49,00
41	Кондиционер LG S18LHP, инв. № 60916	**490,00**	49,00
42	Кондиционер LG S18LHP, инв. № 60923	**490,00**	49,00
43	Кондиционер LG S18LHP, инв. № 60917	**490,00**	49,00
44	Кондиционер LG S18LHP, инв. № 60924	**490,00**	49,00
45	Кондиционер LG S18LHP, инв. № 60918	**490,00**	49,00
46	Кондиционер LG S18LHP, инв. № 60919	**490,00**	49,00
47	Кондиционер LG S18LH, инв. № 60974	**490,00**	49,00
48	Кондиционер LG S24H, инв. № 60655	**560,00**	56,00
49	Кондиционер Panasonic 18 DKD, инв. № 60653	**420,00**	42,00
50	Кондиционер Panasonic 18 DKD, инв. № 60654	**420,00**	42,00
51	Автомобиль AUDI A6, рег. № 5371 АР-3, тип ТС – легковой седан, тип двигателя – дизельный, объем 2,7л, 6-ст. МКПП, колесная формула 4х2, 2006 года выпуска, условно-пригодное техническое состояние	**11 900,00**	1 190,00
52	Водогрейный котел на МТВ, инв. № 61103	**18 900,00**	1 890,00
53	Водогрейный котел на МТВ, инв. № 61104	**18 900,00**	1 890,00
54	Сварочный аппарат Herman Shark 505M, инв. № 61332	**14 000,00**	1 400,00
Акрамя цырымоніі ўручэння прэміі, якая абяцае стаць адной з яркіх і знакавых падзей Дня беларускага пісьменства ў Бялынічах, Саюз пісьменнікаў Беларусі рыхтуе да свята слова шэраг іншых творчых праектаў. Так, будуць абвешчаныя вынікі рэспубліканскага творчага конкурсу буктрэйлераў «Кніга з экрана». Ужо традыцыйна адбудзецца міжнародны круглы стол, удзел у якім мяркуюць узяць літаратары з Беларусі, Расіі, Украіны, Латвіі, Літвы, Малдовы, Грузіі, Азербайджана, Казахстана, Таджыкістана, Сербіі і ЗША — яны прадставяць свае новыя творы, у тым ліку пераклады з/на беларускую мову. «Таксама будзем абмяркоўваць важную для ўсіх краін свету тэму — уплыў слова на свядомасць людзей, літаратура і публіцыстыка як сродак усталявання міру і спакою. Дыпламатыя слова — надзвычай важная рэч, якая спрыяе ўзаемаразуменню, вельмі патрэбнаму нам сёння», — расказала Алена Стэльмах.

У Бялыніцкай дзіцячай школе мастацтваў плануецца зладзіць творчую сустрэчу пісьменнікаў з жыхарамі горада, Мінскі тэатр паэзіі прадставіць літаратурны спектакль «Старонцы мілай пакланюся». А на тэматычнай пляцоўцы «Слова пісьменніка» і стэндах выдавецтваў у рэжыме нон-стоп будуць праходзіць аўтограф-сесіі і прэзентацыі твораў маладых і масцітых аўтараў — толькі сталічныя паэты і пісьменнікі, заўважае **кіраўнік Мінскага гарадскога аддзялення Саюза пісьменнікаў Міхась ПАЗНЯКОЎ,** летась выдалі больш за 100 кніг.

Вікторыя ЗАХАРАВА.

На экранах

Страх і нянавісць у намінанце на «Залатога льва»

Калі вораг не прыходзіць сам, яго можна прыдумаць

У пакрысе мацнеючым кінапракаце, што аднаўляецца пасля каранавірусnай паўзы, з'явіўся водгалас мінулага Венецыянскага кінафестывалю: гэтымі днямі на вялікім экране ў Мінску паказваецца адзін з намінантаў на «Залатога льва» — аднайменная экранізацыя рамана лаўрэата Букераўскай і Нобелеўскай прэмій Джона Максвела Кутзее «У чаканні варвараў». У аснове сюжэта ляжыць прымітыўная ідэя брутальнай каланізацыі, затое ў яе ўвасабленні знаходзяцца візуалізаваныя механізмы жорсткага дамінавання, схемы бязглуздых дзеянняў дзеля захавання моцы метраполіі і мудрагеліста ўзніклае каханне, дзе мог бы пакорпацца Фрэйд. Неабходны Імперыі вораг, катаванні і дарэмныя ахвяры — і ўмоўны свет Кутзее і рэжысёра Сіра Гера рэзануе з нашай сённяшняй рэчаіснасцю.

Фантастычны раман выйшаў у 1980 годзе і пасля ўручэння яго аўтару Нобелеўскай прэміі трапіў у спіс «найвялікшых кніг XX стагоддзя» брытанскага выдавецтва Penguin Books — апісаны ў ім свет не існуе і не носіць рэальна існуючай назвы, але, вядома, знаходзіць пэўныя паралелі ў сусветнай гісторыі. Не кажучы ўжо аб тым, што не прамыя, але ўсё ж пераклічкі з кнігай бачацца то тут, то там, у тым ліку на вуліцах беларускіх гарадоў.

Да экранізацыі рамана быў прыцягнуты «фестывальны» рэжысёр Сіра Гера, што мае не залатыя, але ўсё ж узнагароды з Кан, Сан-Себасцьяна, «Сандэнса», а цяпер і Венецыі. А таксама топавыя акцёры Марк Райлэнс, Джоні Дэп і Роберт Пацінсан, якія ў фільме ўвасабляюць сабой розныя дзяржаўныя «прадукты».

Паводле сюжэта, на сваёй ускраіне Імперыя знаходзіць ворагаў: насамрэч іх не існуе, але калі яны спатрэбіліся, прадстаўнікі метраполіі ўзяліся за мясцовыя плямёны, якіх лічаць за варвараў, — цудоўны прыклад таго, як фальшывая фармулёўка вызначае стаўленне і дзеянні, бо, як вядома, «мова ёсць спосаб светавытлумачэння», значыць, яна здольная паказаць, якім «цэнтр» бачыць наваколле.

Асноўныя падзеі адбываюцца ў памежным горадзе-крэпасці, маўляў, стратэгічна важным для метраполіі пункце, што дазваляе Імперыі істэрычна перабольшваць альбо нават выдумляць сабе пагрозы. Надуманасць ідэалогіі, што прыводзіць да фізічнай і псіхалагічнай скалечанасці, смерцяў і адкрытага канфлікту, складае аснову закладзенага ў гісторыю абсурду. Напружанасць падзей нерэлевантная іх першапрычыне, і фільм паказвае прыклад дэструкцыі і скажэнняў рэальнасці праз нерацыянальную палітыку магутнай Імперыі.

Імперыя ўвасабляецца тут галоўным чынам у двух розных і нават супрацьлеглых абліччах, дзе першым з'яўляецца станоўчы магістрат горада — дабрасардэчны дзядзька ў выкананні Марка Райлэнса, які шмат гадоў даглядае ўскраіну, цікавіцца мясцовай культурай і займаецца сваёй работай у прыгожым атачэнні ўтульнага кабінета, поўнага кніг і археалагічных здабыткаў. Фільм увогуле, як водзіцца перад бурай, пачынаецца з ідыліі з магістратам на яе чале: быццам біблейскі горад, зняты ў Марока, жыве сваім жыццём, збірае ўраджай алівак і нават абыходзіцца без турмы, бо злачынствы тут не здзяйсняюцца.

Другое ўвасабленне Імперыі разбурае гэтую ідылію, і з'яўляецца яно ў першую чаргу ў выглядзе Джоні Дэпа, які выканаў, напэўна, сваю самую статычную і нязграбную ролю — палкоўніка Джола ў шыкоўнай ладнай форме і адмысловых акулярах. Потым яму на падмогу прыходзіць неапраўдана жорсткі выслужвальнік афіцэр Мендэл у абліччы Роберта Пацінсана, які паводзіць сябе ў памежным горадзе бы гаспадар, бо ўсведамляе, што можа сабе гэта дазволіць.

Гэтая неабмежаваная ўлада прадстаўнікоў метраполіі як шараговы сімптом выбудаванага ў фільме рэжыму абыгрываецца асобна — яна халодная, п'яная і агіднаа. Пасля катаванняў, якія палкоўнік Джол дазваляе сабе ў дачыненні да падазраваных, ён у простым, але ўдалым прыёме паказваецца за багатым абедам. Успамінаецца Салжаніцын, што ў кнізе «Архіпелаг ГУЛАГ» апавядаў, як і сам у якасці ўжо затрыманага афіцэра адмовіўся несці свой чамадан, прымусіўшы рабіць гэта таксама арыштаванага, але немца.

Тым часам аўтары знаходзяць магчымасць пакпіць з адмоўных герояў, не тое каб адкрыта, бо сур'ёзную інтанацыю ўсё ж трэба захоўваць, але відавочна — паказваюць іх дурнямі, калі тыя прымаюць старажытныя пісьмёны за таемную перапіску магістрата з ворагамі; ганебнымі бязлюдцамі, калі так званыя варвары дасылаюць каланізатарам красамоўны адказ; і проста вартымі жалю чалавечкамі, што, збягаючы, хапаюць са спустошанага горада апошняе, што толькі можна ўзяць. Аўтары кпяць з метраполіі і праз магістрата, якога прынізілі, пазбавілі дома і звялі да ўзроўню адшчапенца, а той захаваў годнасць і здольнасць саркастычна насміхацца з ваеннага прадстаўніцтва Імперыі.

Асобная лінія фільма — гісторыя адносін паміж магістратам і «варваркай», якая сярод іншых была скатаваная падчас кампаніі палкоўніка Джола па пошуку ворагаў. Гэта вельмі своеасаблівая канфігурацыя пачуццяў, якая, з аднаго боку, аздабляе сюжэт умоўна рамантычнай лініяй, а з другога — паказвае псіхалагічны выверт, што можа з'явіцца ў прапанаваных умовах. Скалечаныя ногі дзяўчыны становяцца для магістрата ледзь не фецішам, а іх абмыванне — спробай заглушыць пачуццё віны, ад якога мужчына спрабуе пазбавіцца з таго самага моманту, як тэрмінова загадвае выгнаць заключаных пасля ад'езду палкоўнік, — каб не мулялі вочы. Адзіную, што засталася ў горадзе, давялося прыгрэць на грудзях.

Карціна «У чаканні варвараў» стварыла ўмоўную, але зразумелую сістэму і ўзялася выпінаць яе апорныя пункты — сама па сабе жорсткая каланізацыя, адлюстраваць якую, здаецца, стала задачай стужкі, не з'яўляецца дастаткова самастойным матывам. Фільм расцёкся па кнізе Кутзее і не расставіў акцэнты, якія маглі б якасна перавесці літаратурную мову ў мову кіно. Праз гэта экранізацыя рамана атрымалася безаблічная, што ўдзел Райлэнса, Дэпа і Пацінсана толькі падкрэслілі.

Увесь сеанс мы глядзім, ды са стрыманым смакаваннем жорсткасці, як з-за беспадстаўных дзеянняў ідылія паступова замяшчаецца спусташэннем, — пачуццё несправядлівасці, канешне, займае эфір. Але, напэўна, галоўнае, што ў фільме прадстаўляе цікавасць, — ключавыя праявы рэпрэсіўнай Імперыі, якія можна запісваць быццам па метадычцы. Плюс мараканская карціна, спектр эмоцый і фінал, які дапускае трактоўкі, але ўсё адно не прадугледжвае пазітыву, — нарэшце пракат насычаецца вартым кіно.

Ірэна КАЦЯЛОВІЧ.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА
ОАО «ГРОНИТЕКС»

	Лот № 1		Лот № 2	
Предмет торгов, краткая характеристика	**Капитальное строение, инв. № 400/U-84094** (незавершенное законсервированное капитальное строение), общей площадью 90,4 кв. м, железобетонное, готовность строения – 69 %		**Капитальное строение, инв. № 400/U-84093** (незавершенное законсервированное капитальное строение), общей площадью 1060,9 кв. м, железобетонное, готовность строения – 75 %	
	В зданиях отсутствуют: отопление, водопровод, канализация, электромонтажные работы, отделка, проемы. Консервация – 2013 г.			
Информация о земельном участке	Кадастровый номер 440100000002010139, площадь – 0,0221 га, право аренды по 07.02.2070 г.		Кадастровый номер 440100000002010103, площадь – 0,1655 га, право аренды по 23.01.2070 г.	
	Местонахождение имущества: Гродненская обл., г. Гродно, ул. М. Горького, 91. Здания расположены на территории СЭЗ «Гродно-Инвест», где возможно размещение производственных, коммунально-складских и смешанных производственно-деловых и производственно-административных объектов в соответствии с генеральным планом г. Гродно			
Начальная цена с учетом НДС	**23 520,00 рубля**	Задаток (10 %) – 2 352,00 руб.	**261 600,00 рубля**	Задаток (10 %) – 26 160,00 руб.
Сведения о продавце	Сведения о продавце: ОАО «Гронитекс», г. Гродно, ул. Горького, 91, тел./факс 8 (0152) 431046			
Сведения об организаторе торгов и номер счета для перечисления задатка	Гродненское областное учреждение финансовой поддержки предпринимателей, г. Гродно, ул. Мицкевича, 8, тел. 8 (0152) 621632, номер счета BY65BLBB30150500481906001002 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской обл., код BLBBBY2X, УНП 500481906			
Срок заключения договора купли-продажи: в течение 20 (двадцати) календарных дней после проведения торгов. Условия оплаты: по договоренности сторон				
Торги состоятся 15 сентября 2020 года в 12.00 по адресу: г. Гродно, ул. Мицкевича, 8				
Срок подачи документов	**по 09 сентября 2020 года включительно до 16.00 по адресу: г. Гродно ул. Мицкевича, 8**			

Условия участия и порядок проведения аукциона размещены на сайте организатора торгов www.fincentr.by
Тел. для справок 8 (0152) 621632

ОБЪЯВЛЕНИЕ О ТОРГАХ

Отдел принудительного исполнения
УПИ ГУЮ Мингорисполкома
объявляет о проведении торгов по продаже имущества, принадлежащего Рагойше Максиму Вячеславовичу

Номер лота, вид выставляемого на торги имущества:

Лот № 1. **Изолированное помещение, инв. № 500/D-7112766 (наименование – встроенное помещение учебно-производственной базы, общей площадью 1478,7 кв. м), расположенное по адресу: г. Минск, ул. Холмогорская, 59А-1.**

Начальная цена: 1 054 000,00 рубля.

Имеющиеся обременения: предписание ОПИ Центрального района г. Минска о запрете совершения регистрационных действий, залог, договор аренды.

Место, дата и время проведения торгов: 01.09.2020 в 14.30, г. Минск, ул. Коллекторная, 3, кабинет 108.

Справочная информация: начальник отдела Волович Екатерина Вячеславовна, тел.: 8 (017) 2001096, 8 (044) 5292502 (Viber); upi701@minjust.by, г. Минск, ул. Коллекторная, 3, каб. 108.

В соответствии со статьей 97 Закона Республики Беларусь «Об исполнительном производстве» возмещение затрат на организацию и проведение торгов осуществляется участником, выигравшим торги (покупателем).

Подробная информация об имуществе размещена на сайте **http://just-minsk.gov.by/**

УНП 100223493

Извещение о проведении аукционных торгов в Жабинковском районе Брестской области в частную собственность граждан Республики Беларусь
по продаже не завершенных строительством незаконсервированных жилых домов и земельных участков

№ лота	Наименование объекта/адрес участка	Кадастровый номер	Общая площадь (га)	Начальная цена предмета аукциона (руб.)	Расходы по подготовке зем.-кадастр. док. (руб.)	Сумма задатка (руб.)	Характеристика расположенных на земельном участке инженерных коммуникаций и сооружений Наличие ограничений и охранных зон на земельном участке в связи с его расположением
1	Не завершенный строительством незаконсервированный одноквартирный жилой дом в **г. Жабинка, ул. Белорусская, 5** и земельный участок (капитальное строение (фундамент), площадь застройки – 125 кв. м, готовность основного строения – 11 %)	122550100001000201	0,1350	12 230,04	1551,12	2 400,00	Песчано-гравийное покрытие уличной сети. Электроснабжение. Газоснабжение. Ограничения: - в охранной зоне линии электропередачи напряжением до 1000 вольт на площади 0,0022 га; - в водоохранной зоне р. Жабинка на всей площади
2	Не завершенный строительством незаконсервированный одноквартирный жилой дом в **Жабинковский с/с, д. Нагораны, ул. Брестская, 14** и земельный участок (капитальное строение (хоз. постройка), площадь застройки – 19,2 кв. м, готовность основного строения – 0 %)	122580605101000008	0,1929	4 865,87	1 965,87	900,00	Электроснабжение. Газоснабжение. Гравийное покрытие уличной сети. Ограничения: - в охранной зоне электрических сетей напряжением до 1000 вольт на площади 0,0163 га
3	Не завершенный строительством незаконсервированный одноквартирный жилой дом в **Жабинковский с/с, д. Зеленковщизна, ул. Центральная, 8** и земельный участок (капитальное строение (фундамент), площадь застройки – 64 кв. м, готовность основного строения – 11 %)	122580604101000008	0,2387	5 416,29	1 749,70	1000,00	Электроснабжение. Грунтовое покрытие уличной сети. Ограничения: - на природных территориях, подлежащих специальной охране (в водоохранной зоне реки Жабинка) на всей площади; - на природных территориях, подлежащих специальной охране (в третьем поясе зоны санитарной охраны водного объекта, используемого для хоз.-питьевого водоснабжения, в зоне санитарной охраны в местах водозабора) на всей площади; - на мелиорируемых (мелиорированных) землях на всей площади

Целевое назначение использования участков – строительство и обслуживание одноквартирного жилого дома

Организатор аукционных торгов – КУППАПП «Жабинковская архитектура»

Задаток в размере до 20 % от начальной цены предмета аукциона (лота) перечисляется КУППАПП «Жабинковская архитектура» на р/с № BY30BLBB30120200216137001001 в ЦБУ № 402 ОАО «Белинвестбанк» г. Жабинка, ул. Свободы, 6А, код банка BLBBBY2X, УНП 200216137, ОКПО 148118831000

Аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке продажи не завершенных строительством незаконсервированных жилых домов, дач с публичных торгов, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 23.03.2018 г. № 220 и состоится при наличии не менее двух участников. В аукционе могут участвовать граждане Республики Беларусь.

Перечень документов, представляемый участником аукциона: заявление на участие в аукционе; документ, подтверждающий внесение суммы задатка (задатков); **гражданином** – копия документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования; **представителем гражданина** – нотариально удостоверенная доверенность.

При подаче документов на участие в аукционе граждане, представители граждан предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

Лицо, желающее принять участие в аукционе, обязано подписать с организатором торгов Соглашение, определяющее взаимные права и обязанности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Порядок осмотра объекта осуществляется участником аукциона по согласованию с организатором торгов.

Победитель аукциона либо единственный участник несостоявшегося аукциона, выразивший согласие на предоставление предмета аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %, обязан:

• в течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона либо признания аукциона несостоявшимся, в размере, определенном соответствующим протоколом аукционных торгов, внести:
- часть оплаты предмета аукциона (часть платы – в случае предоставления рассрочки ее внесения в установленном порядке за земельный участок), за вычетом суммы, причитающейся за незавершенный строительством незаконсервированный одноквартирный жилой дом;
- часть платы за предмет аукциона – цена продажи не завершенного строительством незаконсервированного одноквартирного жилого дома, исчисленную пропорционально его удельному весу в начальной цене предмета аукциона, за вычетом расходов, понесенных на оплату оценки;
- возместить расходы, понесенные городским бюджетом по изготовлению земельно-кадастровой документации и государственной регистрации земельного участка;
- компенсировать организатору аукциона затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения (окончательный размер которых определяется до аукциона и фиксируется в соответствующих ведомостях ознакомления участников);

• не позднее одного месяца с момента подписания акта приема-передачи получить разрешение на проведение проектно-изыскательских работ и строительство одноквартирного жилого дома и нежилых построек на придомовой территории на предоставленном земельном участке;
• заключить договор на разработку проектной документации на строительство одноквартирного жилого дома в течение 20 календарных дней с даты получения разрешения на проведение проектно-изыскательских работ и в срок, не превышающий 3 месяцев с даты заключения данного договора, обеспечить ее изготовление;
• представить изготовленную проектную документацию для утверждения в Жабинковский исполнительный комитет в течение 30 календарных дней с даты ее изготовления;
• завершить строительство объекта в сроки, определенные проектной документацией;
• подать заявление о государственной регистрации права на не завершенный строительством незаконсервированный одноквартирный жилой дом и частной собственности на земельный участок в Жабинковское бюро Кобринского филиала РУП «Брестское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру» в течение двух месяцев со дня подписания протокола о результатах аукциона либо признания аукциона несостоявшимся

Размер штрафа, уплачиваемый в случаях, определенных Положением о порядке продажи не завершенных строительством незаконсервированных жилых домов, дач с публичных торгов, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 23.03.2018 г. № 220 и Указом Президента Республики Беларусь «О некоторых вопросах проведения аукционов (конкурсов)» от 05.05.2009 г. № 232 — **2700,00 руб.**

Аукцион состоится 16 сентября 2020 г. в 10.00 по адресу: г. Жабинка, ул. Кирова, 65 (зал заседаний)

Заявки на участие в аукционе принимаются	по адресу: Брестская обл., г. Жабинка, ул. Свободы, 6А	Время работы: с 8.00 до 12.00, с 13.00 до 17.00. Вых.: суббота, воскресенье	Заявки принимаются до 17.00 10.09.2020 г.	Контактные телефоны	+375 1641 32546, 32337

Сайт: au.nca.by, brest-region.gov.by

Извещение о проведении аукциона по продаже земельных участков в частную собственность для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов

Дата, время и место проведения аукциона	**16 сентября 2020 г.** в 14.00 г. Мядель, ул.17 Сентября, д. 7, каб. 15, Мядельский сельский исполнительный комитет
Место, дата и время начала и окончания приема заявлений и прилагаемых к ним документов	г. Мядель, ул. 17 Сентября, д. 7, каб. 17, Мядельский сельский исполнительный комитет, тел.: (801797) 40735, 22352, тел./факс (801797) 40736. С момента опубликования извещения до 16.00 14 сентября 2020 г. В рабочие дни с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00
Порядок осмотра земельных участков на местности	В рабочие дни с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00
Условия проведения аукциона	Наличие не менее двух участников
Продавец	Мядельский сельский исполнительный комитет
Организатор аукциона	Мядельский сельский исполнительный комитет: **г. Мядель, ул. 17 Сентября, д. 7, каб. 15, тел.: (801797) 40735, 22352, тел./факс (801797) 40736**
Размер задатка и документы, представляемые для участия в аукционе	Размер задатка: 10 % от начальной цены. Документы: заверенная банком копия платежного документа, подтверждающего внесение задатка, паспорт или иной документ, удостоверяющий личность, для юридического лица – копия свидетельства о государственной регистрации. Реквизиты: р/с BY54AKBB36410619001106100000 ОАО «АСБ Беларусбанк», ЦБУ № 619 филиала 601 г. Молодечно, код AKBBBY21601, УНН 600380436, код платежа – 04901

Условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона и предоставлении победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона	В течение 10 рабочих дней после утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона либо после признания аукциона не состоявшимся внести плату за земельный участок (часть платы – в случае предоставления рассрочки ее внесения в установленном порядке); - возместить затраты, связанные с проведением аукциона и формированием земельного участка, в том числе с государственной регистрацией в отношении создания земельного участка и публикацией извещений об аукционе в средствах массовой информации; - в течение двух месяцев после проведения аукциона осуществить государственную регистрацию земельного участка, прав, ограничений (обременений) прав на него в Мядельском бюро Молодечненского филиала республиканского унитарного предприятия «Минское областное агентство по государственной регистрации и земельному кадастру»; - в установленном порядке получить разрешение на строительство жилого дома; - приступить к занятию (освоению) земельного участка не позднее одного года со дня государственной регистрации создания земельного участка и возникновения права на него в соответствии с целью его предоставления (начать строительство, иное освоение земельного участка); - произвести снятие плодородного слоя грунта и использовать его для нужд, связанных со строительством объекта; соблюдать режим хозяйственной деятельности в водоохранной зоне
Шаг аукциона	5 % от предыдущей цены
Наименование объектов аукциона	Земельные участки для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома (для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома) с объектами обслуживания)
Дополнительно	В соответствии с постановлением Совета Министров РБ от 01.04.2014 г. № 298 «Об утверждении Положения о порядке возмещения лицом, которому предоставлен земельный участок, затрат на строительство, в т. ч. проектирование, объектов распределительной инженерной и транспортной инфраструктуры к такому земельному участку» в отношении земельных участков, расположенных в д. Гатовичи, требуется возмещение затрат, а в отношении земельных участков, расположенных в д. Шиковичи, д. Азарки-Дворище, д. Азарки-Пудовинка – возмещение не требуется

№ лота	Адрес земельного участка	Площадь (га)	Кадастровый номер	Начальная цена (бел. руб.)	Ограничения в использовании земельного участка	Характеристика расположенных на земельном участке инженерных коммуникаций и сооружений	Информация о затратах на организацию и проведение аукциона (в том числе: формирование земельного участка, оформление градостроительного паспорта, государственная регистрация земельного участка, публикация извещения о проведении аукциона)
1	Минская обл., Мядельский р-н, д. Гатовичи, ул. Новая, уч. № 2	0,1320	624083103601000263	27000	В связи с его расположением в водоохранной зоне озера Нарочь на площади 0,1320 га	Асфальтированный подъезд. Подключение электроэнергии от проектируемых сетей РИЗ «Гатовичи». Имеется возможность газификации.	1 679 р. 94 к.
2	Минская обл., Мядельский р-н, д. Гатовичи, ул. Новая, уч. № 8	0,1320	624083103601000279	30000	В связи с его расположением в водоохранной зоне озера Мястро на площади 0,1320 га		1 679 р. 94 к.
3	Минская обл., Мядельский р-н, д. Гатовичи, ул. Новая, уч. б/н	0,1542	624083103601000280	30000	В связи с его расположением в водоохранной зоне озера Мястро на площади 0,1542 га	Центральные водоснабжение, водоотведение в населенном пункте отсутствуют	1 679 р. 94 к.
4	Минская обл., Мядельский р-н, д. Шиковичи, уч. № 1	0,1725	624083111601000116	5000	В связи с расположением в водоохранной зоне озера Баторино на площади 0,1725 га	Имеется подъезд. Имеется техническая возможность газификации от индивидуальной баллонной установки. Центральные водоснабжение, водоотведение, газоснабжение в населенном пункте отсутствуют. Имеется возможность электрификации	1 709 р. 62 к.
5	Минская обл., Мядельский р-н, д. Шиковичи, уч. № 2	0,1725	624083111601000117	5000			1 709 р. 62 к.
6	Минская обл., Мядельский р-н, д. Шиковичи, уч. № 3	0,1725	624083111601000118	5000			1 709 р. 62 к.
7	Минская обл., Мядельский р-н, д. Азарки-Пудовинка	0,25	624083100601000098	5000	В связи с его расположением в охранной зоне линии электропередачи, напряжением до 1000 В на площади 0,002 га	Электрические сети, асфальтированный подъезд. Имеется возможность газификации	1 748 р. 93 к.
8	Минская обл., Мядельский р-н, д. Азарки-Дворище	0,2258	624083100101000051	5000	В связи с его расположением в охранной зоне линии электропередачи, напряжением до 1000 В на площади 0,006 га, охранной зоне сетей и сооружений газоснабжения на площади 0,0062 га		1 748 р. 93 к.

ВАРАЖБА НА НІЛЕ

Чаму ў Афрыцы абвастраецца барацьба за ваду?

ДЗВЕ суседнія краіны Афрыканскага кантынента, адны з самых населеных (больш чым 100 мільёнаў чалавек кожная) знаходзіліся на мяжы вайны. І толькі тэрміновае ўмяшанне прэзідэнта Паўднёва-Афрыканскай Рэспублікі Сірыла Рамафосы і кіраўніцтва Афрыканскага саюза дазволілі пасадзіць канфліктуючыя Егіпет і Эфіопію за стол перагавораў. У абмеркаванні быў прадстаўлены і Судан — яшчэ адзін удзельнік гэтага «трохвугольніка супрацьстаяння». Прычына спрэчак — гідраэлектрастанцыя «Хідасэ», або «Плаціна вялікага адраджэння Эфіопіі» (Grand Ethiopian Renaissance Dam — GERD), якая ўзводзіцца на Блакітным Ніле. Яна павінна стаць найбуйнейшай на Чорным кантыненце, праектная магутнасць складае 6,45 гігавата. Для Адыс-Абебы гэты грандыёзны праект стратэгічна выгадны, аднак для Каіра і Хартума яго рэалізацыя, сцвярджаюць спецыялісты, мае сур'ёзныя рызыкі. Да чаго ж прывядзе «варажба на Ніле»?

БЕЛЫ, ЖОЎТЫ, БЛАКІТНЫ, ЧОРНЫ

Ніл — насамрэч сусветны брэнд, разам з пустыняй Сахара гэта адзін з галоўных сімвалаў Чорнага кантынента. Рака бярэ пачатак на Усходне-Афрыканскім пласкагор'і і ўпадае ў Міжземнае мора, утвараючы дэльту плошчай 24 тысячы квадратных кіламетраў. Водная сістэма Ніла лічыцца самай доўгай на Зямлі — 6852 кіламетры. Гэта адзіная рака Паўночнай Афрыкі, якая праходзіць праз Сахару і даносіць свае воды да Міжземнага мора, з'яўляючыся крыніцай жыцця ў бязводнай пустыні. Пастаянны вадацёк Ніла існуе за кошт ападкаў, што выпадаюць у больш паўднёвых абласцях і такім чынам сілкуюць яго вытокі.

Белы Ніл пачынаецца ў экватарыяльным поясе, там ён папаўняецца ад круглагадовых дажджоў. У вярхоўях узровень яго вельмі высокі і даволі сталы, бо яшчэ рэгулюецца азёрамі. Аднак у межах Верхне-Нільскай катлавіны вялікая колькасць вады губляецца на выпарэнне, і ў сілкаванні ракі ніжэй Хартума больш важнае значэнне мае Блакітны Ніл, які нясе багатыя воды пасля летніх дажджоў, што выпадаюць на Абісінскім сугор'і.

Цікава, што тры прытокі Белага Ніла маюць назвы, звязаныя з колерам. Сабат (ад арабскай Бахр-эль-Асфар — «жоўтая рака»), Блакітны Ніл, Атбара (ад арабскага Бахр-эль-Асвад — «чорная рака») — правы прыток ніжэй Хартума. Як сцвярджаюць спецыялісты, «каляровыя» назвы невыпадковыя і маюць сімвалічнае значэнне.

ЕГІПЕЦКІ ІНТАРЭС

Водныя рэсурсы Ніла са старажытных часоў выкарыстоўваюцца для арашэння і натуральнага ўгнаення палеткаў, рыбалоўства, водазабеспячэння і суднаходства. Цяпер яны прымяняюцца і для выробку гідраэнергіі: энергетычны патэнцыял Ніла ацэньваецца ва ўнушальныя 50 гігават. Сумарная даўжыня суднаходных участкаў складае 3,2 тысячы кіламетраў. Асабліва важная рака для Егіпта, дзе ў прыбярэжнай паласе шырынёй 10-15 кіламетраў жыве каля 97 працэнтаў насельніцтва краіны. Ніл у ніжнім цячэнні перыядычна разліваецца, затапляючы ўсю даліну. Прытокі ракі, што сцякаюць з Абісінскага нагор'я, прыносяць вялікую колькасць глею, які асядае падчас разліву. Гэтае рэгулярнае ўгнаенне адыгрывае вялікую ролю ў земляробстве Егіпта.

Стварэнне Асуанскага гідракомплексу паспрыяла шматгадоваму рэгуляванню сцёку Ніла, ліквідавала пагрозу катастрафічных паводак (раней падчас паводкі ўзровень вады ў рацэ каля Каіра ўздымаўся да васьмі метраў!) і дазволіла павялічыць агульную плошчу зямель, якія арашаюцца. Кантроль над паступленнем вады стварыў умовы для круглагадовага арашэння, і цяпер у некаторых абласцях можна здымаць тры ўраджаі ў год. На Ніле стаяць буйныя

гарады Хартум, Асуан, Луксор (Фівы), гарадская агламерацыя Каір—Гіза, а ў дэльце — Александрыя. Рака на поўнач ад Асуана — папулярны турыстычны маршрут.

ПЕРСПЕКТЫВЫ І РЫЗЫКІ

Будаўніцтва ГЭС «Хідасэ» на Блакітным Ніле вядзецца з 2011 года. Але гэта не проста грандыёзны і дарагі (каля 4,8 мільярда долараў) праект. «Адраджэнне» ператварылася ў свайго роду эфіопскую нацыянальную ідэю, гэта галоўная стаўка дзяржавы на сацыяльна-эканамічны прарыў. Больш за палову велізарнага насельніцтва Эфіопіі жыве без электрычнасці. Запуск ГЭС (па афіцыйных звестках, на цяперашні момант выканана тры чвэрці работ) не толькі пакрые ўнутраныя патрэбы краіны і дасць магутны імпульс для сацыяльна-эканамічнага развіцця, але і дазволіць экспартаваць электраэнергію суседзям, якія вельмі ў гэтым зацікаўлены, бо таксама сутыкаюцца з падобнымі цяжкасцямі.

Аднак гэтая дабратворная карціна мае зваротны бок: тое, што добра для Эфіопіі, пагражае сур'ёзнымі праблемамі дзяржавам, размешчаным на поўнач ад яе. Плаціна на Блакітным Ніле можа выклікаць засуху на егіпецкіх і суданскіх тэрыторыях, перабоі ў рабоце Асуанскага гідравузла ў Егіпце і, як вынік, удары па эканоміцы, пагаршэнне жыцця насельніцтва і нават голад.

«94 працэнты тэрыторыі Егіпта складае пустыня, — заявіў міністр водных рэсурсаў і ірыгацыі краіны Махамед Абдэль Аці на канферэнцыі па праблемах егіпецкай сельскай гаспадаркі ў перыяд пандэміі каранавіруса, — а 94 працэнты плошчы Эфіопіі — гэта «зялёная зона». Такім быў адказ егіпецкага чыноўніка на абвінавачванне яго краіны ў тым, што Егіпет забірае сабе львіную долю вады з Ніла.

Адным з галоўных аргументаў Абдэля Аці стала тое, што ў Эфіопіі выдатна развіта жывёлагадоўля, агульны статак налічвае 100 мільёнаў галоў. Вядома, што асноўным спажыўцом вады ў Афрыцы з'яўляецца менавіта гэтая галіна. І краіна бярэ з агульнага рэзервуара ваду, нягледзячы на наяўнасць уласных багатых крыніц: колькасць «блакітнай» вады ў возеры Віктарыя складае амаль 3000 кубічных кіламетраў. Да гэтага дадаецца «зялёная» вада ў лясах і на пашах, а таксама багацце дажджавой і падземнай вады. «А вось Егіпет пакутуе ад недахопу вады, нягледзячы на пастаяннае павелічэнне яго патрэб», — заўважыў Абдэль Аці.

ЦЯЖКІЯ ПЕРАГАВОРЫ

Не дзіўна, што Эфіопія да гэтага часу не можа прыйсці да згоды з Егіптам і Суданам, чые інтарэсы былі закрануты ў выніку ўзвядзення новага мегааб'екта ў Афрыцы. Буйнамаштабны праект плануецца цалкам завяршыць да 2022 года, але тэрміны заканчэння будаўніцтва ўжо неаднаразова зрушваліся ў сувязі з прэтэнзіямі, якія прад'яўлялі Адыс-Абебе Каір і Хартум.

Перагаворы працягваюцца з моманту закладкі плаціны. Асноўны канфлікт разгортваецца паміж Адыс-Абебай і Каірам, Хартум

займае другарадную пазіцыю. З пачатку ўзвядзення ГЭС краіны ўжо правялі больш за дзясятак раўндаў перагавораў з мэтай урэгулявання пытанняў аб заканчэнні будаўніцтва плаціны, умовах яе эксплуатацыі і размеркавання вады, аднак шэраг рознагалоссяў дасюль застаўся нявырашаны.

За гэты час Егіпет, Судан і Эфіопія падпісалі сумесную дэкларацыю краін басейна Ніла, якая ўключае пункт аб справядлівым выкарыстанні яго водных рэсурсаў (якое кожны з бакоў разумее выключна па-свойму). Паколькі напружанасць паміж Адыс-Абебай і Каірам захоўвалася, два гады таму было вырашана арганізаваць групу навукоўцаў па пяць чалавек ад кожнай з трох краін. Таксама была створана міжурадавая камісія па Ніле са штаб-кватэрай на нейтральнай тэрыторыі — ва Угандзе.

У лютым 2020 года былі прызначаныя трохбаковыя перагаворы па плаціне ў Вашынгтоне, дзе ЗША выступалі ў ролі назіральніка. Аднак яны аказаліся цалкам правалены пасля адмовы ад удзелу ў іх эфіопскага боку. Улады Эфіопіі абвінавацілі ЗША: маўляў, яны перасталі адыгрываць ролю нейтральнага назіральніка пасля заявы Вашынгтона, што плаціна не павінна быць завершана без дасягнення пагаднення з Егіптам.

Пасол Эфіопіі ў Расіі Алемаеху Тэгену Аргау растлумачыў, што яго краіна выступае супраць удзелу «іншых гульцоў» у перагаворах па будаўніцтве і эксплуатацыі плаціны. Дыпламат заявіў, што найлепшы фармат перагавораў — пад эгідай Афрыканскага саюза, бо ўзвядзенне плаціны з'яўляецца пытаннем развіцця Эфіопіі і кантынента ў цэлым.

У сваю чаргу, міністр замежных спраў Эфіопіі Геду Андаргачэу абвінаваціў Егіпет у спробе ўшчаміць інтарэсы Эфіопіі і Судана падчас перагавораў па GERD. «Замест сур'ёзнага абмеркавання Егіпет выкарыстаў перагаворную платформу для вылучэння патрабаванняў, каб плаціна была меншая, несла меншы аб'ём вады і ператварылася ў нешта, што не адпавядала б нашым патрэбам», — заявіў кіраўнік МЗС Эфіопіі. Таксама Андаргачэу адзначыў, што егіпецкі бок павінен скончыць стаяць на перашкодзе і заняцца, нарэшце, супрацоўніцтвам з Адыс-Абебай і Хартумам па пытаннях, звязаных з узвядзеннем плаціны.

НА ПАЎЗЕ

Зараз ужо завершаны першы этап запаўнення вадасховішча. Для поўнага запаўнення, згодна з графікам, спатрэбіцца ад чатырох да сямі гадоў. Улады Эфіопіі адзначаюць, што графік можна скараціць на тэрмін, меншы за чатыры гады, але на карысць размешчаных ніжэй па цячэнні Ніла краін Адыс-Абеба можа гагадзіцца на карэкціроўку тэрмінаў.

Тым не менш паміж трыма краінамі яшчэ застаюцца рознагалоссі па тэхнічных і прававых аспектах эксплуатацыі GERD. Яны звязаны з настойлівымі патрабаваннямі Егіпта аб гістарычным праве на Ніл, у той час як суседнія краіны ўзбярэжжа, у тым ліку Эфіопія і Судан, засноўваюць сваю дыпламатыю на натуральных правах.

ГЭС «Хідасэ» ўяўляе пагрозу для жыхароў Судана. З такой заявай выступіла міністэрства ірыгацыі гэтай краіны пасля чарговых перагавораў з Эфіопіяй і Егіптам з нагоды будаўніцтва плаціны. Пра гэта паведаміла турэцкае інфармагенцтва Anadolu. «Падкрэсліваем сур'ёзнасць рызык, якія плаціна ўяўляе для Судана і яго жыхароў, у тым ліку экалагічных і сацыяльных рызык, а таксама для бяспекі мільёнаў жыхароў уздоўж берагоў Блакітнага Ніла», — заявіла суданскае ведамства.

Пасля гэтых перагавораў Каір абвясціў пра рашэнне адмовіцца ад далейшага абмеркавання. Егіпет вырашыў узяць паўзу для ўнутраных кансультацый. Такім чынам ён адрэагаваў на прапанаваны Адыс-Абебай новы праект запаўнення вадасховішча.

Хутчэй за ўсё, плаціна будзе дабудавана і запушчана, а бакі працягнуць дамаўляцца па спрэчных момантах ужо пасля гэтага. Шанцы на мірнае ўрэгуляванне канфлікту, вядома, ёсць: і Каір, і Адыс-Абеба на словах настроены ваяўніча, але, натуральна, хочуць пазбегнуць вайны. «Варажба на Ніле» працягваецца.

Захар БУРАК.

алімпіец
ЗВЯЗДА
Сумесны праект газеты «Звязда», Нацыянальнага алімпійскага камітэта і Міністэрства спорту і турызму Рэспублікі Беларусь

Чым жыве паралімпійскі спорт у Беларусі

Кінуць выклік лёсу

Пра спартсменаў з абмежаванымі магчымасцямі гавораць не так часта, як хацелася б. А між тым у іх ёсць чаму павучыцца — мужнасці, сіле духу і ўменню дасягаць сваіх мэт.
Пандэмія каранавіруса і яе наступствы ўнеслі карэктывы не толькі ў алімпійскі, але і ў паралімпійскі рух. XVI Паралімпійскія летнія гульні пройдуць у Токіа з 24 жніўня да 5 верасня 2021 года. Як беларусы рыхтуюцца да галоўных стартаў і як развіваецца паралімпійскі рух, расказаў генеральны сакратар Паралімпійскага нацыянальнага камітэта Рэспублікі Беларусь Мікалай ШУДЗЕЙКА.

Перанос паралімпіяды на год Мікалай Мікалаевіч лічыць разумным рашэннем. «Вучэбна-трэніровачны працэс не спыняўся. Асаблівай панікі ні ў кога не было, хіба што лёгкае пачуцце прыкрасці. Але работу ніхто не спыняў. Трэнеры хутка адкарэктавалі графік, адаптавалі яго пад сітуацыю. Усе спартсмены спакойна ўспрынялі новыя ўмовы. Яшчэ на гэтым не заканчваецца».

Паралімпійцы аказаліся ў выгадным становішчы. У некаторых відах спорту адбываецца змена пакаленняў. Кваліфікацыйны перыяд на паралімпіяду яшчэ не скончаны, і ў моладзі ёсць час выступіць на турнірах, набраць рэйтынгавыя балы і адабрацца на гульні. Верагодна, налета беларуская паралімпійская каманда папоўніцца моцнымі спартсменамі.

ВЯЛІКІЯ НАДЗЕІ

Пакуль паралімпійцы заваявалі 10 ліцэнзій у Токіа, адна з іх у лёгкай атлетыцы. Дзевяць ліцэнзій зарабілі плыўцы: сем мужчынскіх і дзве жаночыя. У планах — атрымаць пуцёўкі на паралімпійскія спаборніцтвы па дзюдо, фехтаванні, веславанні на байдарках і каноэ, акадэмічным веславанні. У 2021 годзе ў праграму Паралімпійскіх гульняў дададуцца бадмінтон і тхэквандо. У Брэсце сфарміравалася добрая школа тхэквандо, і ў беларусаў ёсць усе шанцы раздзяліць паралімпійскі дэбют гэтага віду спорту.

Вялікія надзеі кіраўніцтва Паралімпійскага камітэта ўскладае на ліцэнзіі ў тэнісе на інвалідных калясках: «Каляндар дазваляе выступаць на спаборніцтвах і набіраць балы для ліцэнзіі. Калі не атрымаецца зарабіць ліцэнзію, то wild card (асаблівае запрашэнне на спаборніцтва для спартсмена, які не прайшоў кваліфікацыю. — **«Зв.»**) у нас дакладна павінна быць».

Сярод безыменных ліцэнзій у плаванні ёсць і імянное запрашэнне. Арганізатары паралімпіяды запрашаюць Аляксея Талая паспаборнічаць за тытул паралімпійскага чэмпіёна. Аляксей — спартсмен без рук і ног, які стаў зоркай міжнародных спаборніцтваў. «Лёша выступае ў цяжкім класе, дзе мала спартсменаў. І каб спаборніцтвы адбыліся, патрэбна пэўная колькасць удзельнікаў. Вось арганізатары яго персанальна і запрашаюць. Я ўпэўнены, што характар змагара і жыццёвы стрыжань дапамогуць яму падрыхтавацца і годна выступіць на паралімпіядзе», — адзначыў Мікалай Шудзейка.

На Паралімпійскіх гульнях у Лондане, а потым у Рыа сапраўдны фурор здзейсніў сціплы беларускі хлопец Ігар Бокій. У 2012 годзе ён заваяваў пяць залатых медалёў, у 2016 — шэсць залатых і адзін бронзавы. У Токіа ў 11-разовы паралімпійскі чэмпіён па плаванні можа калі не пераўзысці, то паўтарыць свой поспех. «Ігар — унікум. Спецыялісты адзначаюць, што ён валодае асаблівай плывучасцю. Бог даў яму вялікі талент, а Ігар любіць ды ўмее працаваць, каб пастаянна ўдасканальваць свае навыкі. Мы шчыра верым, што ў Токіа ён зноў заваюе россып узнагарод», — кажа генеральны сакратар Паралімпійскага камітэта.

САКРЭТ МАЙСТЭРСТВА

Усяго ў спісах нацыянальных і зборных каманд Беларусі 88 топавых спартсменаў-паралімпійцаў. Дзякуючы новым методыкам падрыхтоўкі, развіццю фармакалогіі і медыцыны ўзровень спартыўнага майстэрства ў свеце значна ўзрос, адпаведна, выраслі і канкурэнцыя. Але беларусы не адстаюць. «Нам вельмі дапамагаюць Міністэрства спорту і турызму, спартыўныя федэрацыі. Асобны дзякуй рэгіянальным адміністрацыям, якія падтрымліваюць сваіх землякоў паралімпійцаў».

Шмат залежыць і ад трэнераў, якія працуюць са спартсменамі. Мікалай Шудзейка кажа, што сакрэт поспеху паралімпійскага руху ў Беларусі — у сімбіёзе ўзросту, вопыту і маладосці: «Настасся Шляпцова — малады трэнер па тэнісе на — інвалідных калясках. Сама ў мінулым спартсменка, але, відаць, вырашыла, што другой Вікторыяй Азаранка ёй не стаць, і пераключылася на трэнерскую работу. У яе асаблівы дар прыцягваць да сябе людзей. І яна гарыць сваёй справай. Генадзь Вішнякоў, трэнер Ігара Бокія, — скарбніца ведаў. Ён захапіўся падрыхтоўкай рэзерву, актыўна працуе з моладдзю. Сабраў каманду маладых таленавітых спецыялістаў. У кожнага з іх ёсць свая група спартсменаў, і мы ўжо назіраем канкурэнцыю. А здаровая канкурэнцыя ў спорце матывуе і рухае наперад».

Мастацтва трэнера, які працуе з людзьмі з асаблівасцямі здароўя, заключаецца і ў тым, каб фізічныя нагрузкі не прыносілі шкоду арганізму. У штаце нацыянальнай паралімпійскай каманды — 10 заслужаных трэнераў Рэспублікі Беларусь. Спартсмены кожны сезон праходзяць дэталёвае медыцынскае абследаванне, з імі пастаянна працуе ўрач. Гэта дапамагае павышэнню спартыўнага майстэрства і паляпшэнню вынікаў.

СПОРТ ЯК ЛАД ЖЫЦЦЯ

Мікалай Шудзейка лічыць, што спорт неабходны інвалідам: «Гэта цудоўны спосаб самарэалізацыі. Чалавек мае магчымасць убачыць свет, завесці новых сяброў, атрымаць прызнанне. Ён разумее, што грамадства па заслугах ацэньвае яго працу. Чалавек адчувае сябе патрэбным».

Для развіцця спорту неабходны рэзерв. Суразмоўнік называе гэтае пытанне балючай тэмай. Але работа ў такім кірунку вядзецца. Добры трэнд у сацыяльнай палітыцы — школы інклюзіўнай адукацыі. У Мінску пяць такіх школ, дзе вучацца дзеці з інваліднасцю. «У сталічнай школе № 12 мы стварылі музей паралімпійскай славы, рэгулярна праводзім там мерапрыемствы, — расказвае Мікалай Мікалаевіч. — Нацыянальны паралімпійскі камітэт падтрымлівае цесныя сувязі са спецыялізаванымі школамі для дзяцей з парушэннямі слыху і зроку. Такія школы ёсць у Маладзечне, Шклове, Васілевічах, Жабінцы і Гродне — у кожнай вобласці, акрамя Віцебскай. У маладзечанскай школе асноўны спорт — лёгкая атлетыка. Там працуе галоўны трэнер нацыянальнай каманды Ігар Фартуноў. З розных гарадоў туды прыехалі лёгкаатлеты. Выдатная група атрымалася, дзеткі растуць і развіваюцца на вачах. Праўда, часам вялікая праблема — пераканаць бацькоў «адарваць» крывіначку ад дому і адпусціць у іншы горад».

Часта спартсмены, сутыкнуўшыся з пагаршэннем здароўя, не хочуць развівацца са спортам і пераходзяць у разрад паралімпійцаў. Дарэчы, у такой сітуацыі ў 14 гадоў аказаўся Ігар Бокій. Нацыянальны паралімпійскі камітэт рады дапамагчы ўсім, калі ў спартсмена няма агульных медыцынскіх супрацьпаказанняў. Але і гатовых спартсменаў трэба падрыхтаваць да новых правілаў. Па словах Мікалая Мікалаевіча, работы шмат, але яно таго варта.

ТОЕ, ШТО ВАЖНА

Развіццё паралімпійскага спорту робіць відавочнай важную праблему — стварэнне безбар'ернага асяроддзя. «Гэта адно з самых актуальных пытанняў у нашай рабоце. Выязджаючы на спаборніцтвы, атрымліваем дзяржаўную задачу — прывезці як мага больш інфармацыі пра безбар'ернае асяроддзе ў іншых краінах. Уважліва за гэтым назіраем, прывозім фота, буклеты, усяляк перайманем вопыт. І паціху ў нас усё змяняецца. Элементарны прыклад — практычна ўсюды ёсць жоўтая рыфлёная плітка для невідушчых людзей. Новыя станцыі метро маюць ліфты і пад'ёмныя прылады. Сучасныя спартыўныя аб'екты на 100 % адаптаваныя пад патрэбы інвалідаў. Калі рэканструявалі стадыён «Дынама», усё безбар'ернае асяроддзе ўзгаднялі з намі. Стадыён у гэтым плане вельмі добры. Басейн і лёгкаатлетычны манеж БДУФК — выдатны прыклад, мы там часта спаборніцтвы праводзім. Вяслярны канал у Брэсце — узор па стварэнні безбар'ернага асяроддзя. На шчасце, наша грамадства разумее, што ёсць людзі з абмежаванымі патрэбамі, якім трэба стварыць умовы».

Паралімпійцы — унікальныя людзі. Гэта тлумачыцца не толькі тым, як яны спраўляюцца з нягодамі, але і тым, як доўга яны гэта робяць. Тамара Сівакова, пяцікратная паралімпійская чэмпіёнка па лёгкай атлетыцы, якая дагэтуль выступае, 16 жніўня адзначыць свой 55-гадовы юбілей. Лыжніку і біятланісту Дзмітрыю Лобану 39 гадоў, лёгкаатлету Юрыю Бучкову — 49. Найстарэйшая з членаў нацыянальнай каманды па лёгкай атлетыцы — 36-гадовая Ганна Канюк. Нядаўна скончыла кар'еру 52-гадовая лыжніца і біятланістка Ядвіга Скорабагатая. «Гэтыя людзі салідна ўзросту застаюцца канкурэнтаздольнымі. Усё залежыць ад чалавека. Калі ён настроены сур'ёзна і робіць усё для дасягнення мэты, ён доўга будзе наверсе. У нас ёсць усе ўмовы для развіцця, і мы падтрымліваем кожнага свайго спартсмена», — адзначае Мікалай Шудзейка.

НА ШЛЯХУ ДА НОВЫХ ДАСЯГНЕННЯЎ

Пра тое, што Нацыянальны паралімпійскі камітэт рады кожнаму спартсмену, сведчыць і вялікая колькасць ахвотных змяніць спартыўнае грамадзянства на беларускае. Да беларускіх паралімпійцаў далучылася расійская дзюдаістка Алена Багданава з татальнай слепатой. На Паралімпійскіх гульнях у яе вагавай катэгорыі, 57 кілаграмаў, павінна быць дзве цалкам сляпыя ўдзельніцы. У суветным рэйтынгу Алена займае другі радок. Гэта гарантуе ёй пуцёўку ў Токіа. Ёсць і адваротныя прыклады. Беларусы Раман Макараў, Сяргей Пунько, Аляксандр Давідовіч выступаюць пад расійскім сцягам. Браты Дзмітрый і Раман Салеі з'ехалі ў Азербайджан, праўда, паралімпійскі чэмпіён па плаванні Дзмітрый Салей вярнуўся на радзіму і зноў выступае за Беларусь.

Пакуль Паралімпійскія гульні знаходзяцца ў ценю галоўнай падзеі свету — Алімпійскіх гульняў. Узнікае пытанне аб справядлівасці. Але Мікалай Шудзейка настроены аптымістычна: «Мы бачым, як змянілася стаўленне грамадства да інвалідаў. І ў гэтым ёсць заслуга нашых спартсменаў. Спадзяюся, на будучых Паралімпійскіх гульнях наша каманда зноў гэта дакажа».

Фота дадзена Нацыянальным паралімпійскім камітэтам.

Ілья ШЫМАНОВІЧ:

«МНЕ ЦІКАВА ДАВЕДАЦЦА, НА ШТО Я ЗДОЛЬНЫ»

Да старту Алімпійскіх гульняў у Токіа застаўся год. Увага да галоўных стартаў ужо наступнай пяцігодкі будзе каласальная. «Звязда» знаёміць сваіх чытачоў са спартсменамі, за якімі наступным летам, затаіўшы дыханне, будзе сачыць Беларусь і ўвесь свет.

На рахунку плыўца Ілы Шымановіча дзясятак нацыянальных рэкордаў, два сярэбраныя медалі чэмпіянату свету — 2018. На чэмпіянаце Еўропы — 2019 беларус двойчы падымаўся на п'едэстал: па «серабро» на 100 метраў і па «бронзу» ў комплекснай эстафеце. На Алімпійскіх гульнях — 2016 у Рыа зорка беларускага брасу не выступаў. Аднак у яго ёсць усе шанцы ўзяць рэванш і паказаць свае здольнасці ў Токіа-2021. Цікава, але сам Ілья ставіцца да гэтага па-філасофску.

— Ілья, самае актуальнае пытанне сёлета для спартсмена: як вы перажываеце пандэмію каранавіруса, адмену спаборніцтваў?

— Як і ўсе людзі, адаптуюся да сітуацыі, якую стварыла пандэмія. Нам давялося раней скончыць сезон. Да красавіка выступалі, а потым адмянілі чэмпіянат Расіі, у якім хацелі паўдзельнічаць, і чэмпіянат Беларусі. Добра, што ў лістападзе змаглі выступіць на Кубку Беларусі. Пакуль я ў планавым адпачынку, пасля буду рыхтавацца да пачатку сезона. Калі ўсё будзе нармальна, то ў кастрычніку павінен быць першы міжнародны старт. На жаль, чэмпіянат свету ў снежні адмянілі.

— Калі даведаліся пра адмену спаборніцтваў, не было крыўдна, што дарма напрацоўвалі форму?

— Спачатку быў незразумелы стан, усе знаходзіліся ў няведанні. А калі стала канчаткова зразумела, што стартаў не будзе, стала злёгку крыўдна. Але і ў такой сітуацыі можна знайсці свае плюсы. У нас з'явіўся дадатковы час адпрацаваць і выправіць свае памылкі, паправіць здароўе. Трэба імкнуцца шукаць ва ўсім станоўчыя бакі. Як сэнс крыўдзіцца на тое, што ад цябе не залежыць?

— Вы не выступалі на Алімпійскіх гульнях 2016 года. У 2020-м таксама не атрымалася. Не было думак, што гэта не проста так?

— Я ні пра што такое не думаў. Зусім не лічу гэта злым рокам ці няўдалым супадзеннем. Не я адзін апынуўся ў такой сітуацыі. Усім спартсменам дасталася доля чакаць і працаваць яшчэ год. Я да гэтага спакойна стаўлюся. Алімпійскія гульні — галоўныя спаборніцтвы ў свеце, якія адбудуцца ў любым выпадку. І кожны спартсмен зробіць усё магчымае, каб там выступіць.

— Планы на Алімпійскія гульні ўжо паставілі?

— Планы важныя для Міністэрства спорту, Нацыянальнага Алімпійскага камітэта, нашай федэрацыі. Мы з трэнерам ніколі не загадваем пэўны вынік ці месца. Мы працуем, каб пастаянна паляпшаць свае вынікі. А які гэта будзе час ці месца — стане відаць пасля фінішу.

— У наступным годзе вам будзе 27 гадоў. Узрост не перашкодзіць паспяховаму выступленню?

— У плане ўзросту ў плыўцоў усё індывідуальна. Цяпер і юніёры ў 15-16 гадоў паказваюць высокія вынікі, зусім не саступаючы 30-гадовым ці 35-гадовым спартсменам. І трапляюць у прызёры. Маладым спартсменам перанос Алімпіяды на год, безумоўна, на руку. У іх ёсць час удасканаліць форму і адабрацца на Алімпійскія гульні. Узроставым спартсменам з гэтым цяжэй, але некрытычна. Трэба знайсці да сябе падыход і выбраць аптымальную сістэму падрыхтоўкі з улікам асаблівасцяў свайго арганізма, свайго ўзросту і мэт.

— Які ўзрост для плыўцоў лічыцца найлепшым?

— Я бачыў статыстыку, згодна з якой на Алімпійскіх гульнях 2012 года ў Лондане сярэдні ўзрост мужчын-плыўцоў быў 27 гадоў. Сучаснае плаванне значна пасталела. Я думаю, справа ў новых метадыках падрыхтоўкі, падводак да спаборніцтваў. Шмат узроставых спартсменаў сярод спрынтараў, акцэнт на хуткасную падрыхтоўку таксама адыгрывае вялікую ролю. Шмат розных аспектаў, і ў кожнага яны свае.

— Ілья, вы ўжо некалькі разоў выступалі ў Токіа, у наступным годзе праблем з акліматызацыяй можна не баяцца?

— Так, апошнія два гады нам шанцавала на Азію. Толькі ў 2019 годзе ездзілі на чэмпіянат свету ў Карэю і на этап Кубка свету ў Токіа. Асаблівых праблем з акліматызацыяй не было. Тым больш што на Алімпійскія гульні мы прылятаем за два тыдні, каб цалкам адаптавацца. Гэта не тое, што на Кубку свету, — прыязджаеш і адразу стартуеш, а потым ужо арганізм пачынае прывыкаць і часам становіцца блага.

— І як вам Токіа?

— Мне ўвогуле даспадобы Азія, асабліва кухня. На мой погляд, Токіа — самы прыгожы і самы цікавы горад. Ён мне падабаецца больш за ўсе гарады, дзе я быў. Людзі, прыгажосць, атмасфера — мне ўсё ў ім імпануе. Не ведаю, чаму кажуць, што гэта вялікі людскі мурашнік. Столькі ж людзей, колькі і ў любым іншым мегаполісе. Хоць, я мабыць, проста не трапляў у час пік. На жаль, не засталі цвіценне сакуры, а вельмі хочацца паглядзець.

— Аднойчы вы адзначылі, што псіхалагічная падрыхтоўка часам важнейшая за фізічную. Можаце растлумачыць чаму?

— Шмат спартсменаў, добра падрыхтаваных фізічна, прыязджаюць на важныя старты і перагараюць, не могуць справіцца з сапернікамі. Зразумела, што паказваць высокі вынік у такім стане немагчыма. Атрымліваецца, што работа прападае. Я пастаянна працую з псіхолагам. Зразумела, што ва ўсіх сваё стаўленне і свой погляд на гэты аспект. Усе-такі псіхалогія — рэч індывідуальная. Мне супрацоўніцтва з псіхолагам дапамагае спраўляцца з сабой, са сваімі думкамі і не адцягвацца на саперніка ці нейкія знешнія раздражняльнікі. На мой погляд, лепш працаваць са спецыялістам, чым сутыкнуцца з псіхалагічнымі праблемамі ў самы адказны момант, напрыклад, на галоўным старце.

— Абмяркоўвалася правядзенне Алімпійскіх гульняў у Токіа без гледачоў. Ці будзе гэта крытычна для вас і наколькі важная падтрымка заўзятараў?

— З пункту гледжання спартсменаў, правядзенне Алімпіяды без гледачоў не стала б катастрофай. Зразумела, што гэта выклікала б вялікія страты прыбытку ад продажу білетаў, сувеніраў і гэтак далей. Кожны спартсмен зацыклены на сабе і сваіх дзеяннях. Канешне, дапамагае, калі трыбуны крычаць словы падтрымкі. Але і без гледачоў можна сканцэнтравацца і паказаць вынік.

— Якія траўмы часцей за ўсё сустракаюцца ў плыўцоў?

— Самая папулярная траўма нашага спорту — праблемы з локцевымі, каленнымі і плечавымі суставамі. Гэта лёгка растлумачыць. Плаванне — цыклічны від спорту. Сустаў пастаянна паўтарае адзін і той жа рух, сціраецца і пачынае хварэць. Я ўжо год змагаюся з запаленчым працэсам у локцевым суставе. Да каго я толькі не звяртаўся, пераносіў самыя розныя працэдуры — але ўсё роўна праблема застаецца нявырашанай.

— Ілья, чаму справай вашага жыцця стала менавіта плаванне?

— Калі я быў малы, бацькі стараліся мяне ўсебакова развіваць і даваць маёй энергіі выхад. Чым я толькі не займаўся ў дзяцінстве — бальныя танцы, баскетбол, плаванне ў дзіцячым садку. Але я быў хваравітым дзіцёнкам. Маме параілі часцей вадзіць мяне ў басейн, каб падправіць здароўе. А я вельмі любіў плаваць і сур'ёзна гэтым заняўся. У 10 гадоў паўстаў выбар паміж бальнымі танцамі і плаваннем. Думаю, зразумела, што я выбраў. Я заўсёды атрымліваў задавальненне ад плавання і ні разу не пашкадаваў, што звязаў з ім сваё жыццё.

— Якія спаборніцтвы можаце назваць самымі адметнымі?

— Кожны старт асаблівы. Нейкі турнір успамінаеш з цеплынёй, некаторыя турніры прыносяць адмоўныя эмоцыі, якія не хочацца ўспамінаць і тым больш дапускаць паўтарэння. Прыемныя ўспаміны выклікае Універсіяда 2017 года, дзе ў мяне былі два залатыя медалі. Запамінальным для мяне стаў чэмпіянат свету 2018 года. Гэта быў мой першы старт з індывідуальнымі ўзнагародамі. Пасля таго як заваяваў там два сярэбраныя медалі, зразумеў, што магу спаборнічаць з найлепшымі плыўцамі. Леташні чэмпіянат Еўропы прынёс як станоўчыя, так і адмоўныя эмоцыі. У паўфінале на 100 метраў пабіў еўрапейскі рэкорд — 55,89 секунды. А ў фінале праплыў за 56,42 секунды і стаў другім. Гэта было павучальнае плаванне.

— Прыязджаючы на адпачынак да мора, людзі імкнуцца ўдосталь наплавацца. Вам жа, атрымліваецца, даводзіцца і на адпачынку займацца работай?

— Калі я на моры, па мне не відаць, што я прафесійны плывец. Акуратна, спакойна плаваю, атрымліваю асалоду ад хваляў. Вельмі люблю нырацъ і разглядаць рыб і падводны свет. Адпачынак — гэта ж не толькі мора і пляж. Я адпачываю, калі побач жывёлы. Вельмі іх люблю. Дзякуй бацькам, што прывілі мне гэтую любоў. Я лічу, што ў кожнага чалавека павінна быць хоць адна жывёлка — найлепшы антыстрэс.

— Ілья, у чым крыніца матывацыі, якая ўтрымлівае вас у спорце?

— Усё вельмі проста. Я атрымліваю каласальнае задавальненне ад сваёй працы. Мне цікава даведацца, на што я здольны і колькі магу прагрэсіраваць. Для самога сябе цікава ўбачыць, чаго магу дасягнуць. Я не хачу ў гэтым супыняцца. Узнагароды і грошы таксама важныя, але для мяне яны на другім месцы. На першым — мой вынік.

Фота з асабістага архіва героя.

Навіны

Турніры серыі Гран-пры па фігурным катанні пройдуць згодна з раскладам

Міжнародны саюз канькабежцаў (ISU) зацвердзіў расклад серыі Гран-пры па фігурным катанні на сезон 2020/2021. Такое рашэнне прынялі на анлайн-пасяджэнні савета арганізацыі.

Плануецца, што першы этап серыі пройдзе з 23 да 25 кастрычніка ў Лас-Вегасе (ЗША). Астатнія этапы спаборніцтваў прымуць Канада, Кітай, Францыя, Японія і Расія. Для кожнай з краін-арганізатараў этап Гран-пры стане нацыянальным чэмпіянатам па фігурным катанні. Міжнародны саюз канькабежцаў падкрэслівае, што забеспячэнне здароўя спартсменаў, трэнераў і суддзяў — прыярытэтнае пытанне пры правядзенні спаборніцтваў.

Фінал серыі Гран-пры, які павінен быў прайсці ў снежні ў Кітаі, можа быць перанесены на пачатак 2021 года. Да гэтага, у лістападзе, Міжнародны саюз канькабежцаў паведаміў аб адмене серыі юніёрскага Гран-пры ў сезоне 2020/2021.

У 2022 годзе Мінск прыме чэмпіянат свету па спартыўнай хадзе

Сусветная лёгкаатлетычная асацыяцыя (World Athletics) назвала дакладныя даты правядзення чэмпіянату свету па спартыўнай хадзе — 22-23 красавіка 2022 года.

Турнір павінен быў прайсці ў Мінску 2-3 мая 2020 года. Але пасля кансультацыі з Беларускай федэрацыяй лёгкай атлетыкі, World Athletics вырашыла перанесці спаборніцтвы з-за пандэміі каранавіруса. Права прыняць сусветны форум па спартыўнай хадзе Беларусь атрымала на пасяджэнні Савета World Athletics у Манака.

Міжнародныя спаборніцтвы па барацьбе пакуль не будуць аднаўляцца

Міжнародная федэрацыя барацьбы на анлайн-пасяджэнні адмяніла свае папярэднія рашэнні аб аднаўленні спаборніцтваў у верасні.

Было вырашана не праводзіць чэмпіянат Еўропы сярод юнакоў, які павінен быў прайсці 5—11 кастрычніка ў Польшчы, і кантынентальны форум сярод юніёраў, запланаваны на 19—25 кастрычніка ў Паўночнай Македоніі. Пакуль не прынятыя рашэнні аб чэмпіянатах свету сярод дарослых, юнакоў і юніёраў. Да гэтага пытанне Міжнародная федэрацыя барацьбы вернецца ў верасні.

Мінск прыме кваліфікацыйныя матчы па гандболе

У 2020 годзе ў палацы спорту «Уручча» пройдуць кваліфікацыі на чэмпіянат Еўропы — 2022 і чэмпіянат свету — 2021.

Міністэрства спорту і турызму дало афіцыйны дазвол на правядзенне двух адборачных матчаў мужчынскага чэмпіянату Еўропы — 2022. Нацыянальная мужчынская каманда Беларусі сустрэнецца з сапернікамі з Украіны ў сталічным палацы спорту «Уручча». Гульні пройдуць 5 і 7 лістапада 2020 года.

Беларуская федэрацыя гандболу скарыстаецца першачарговым правам арганізацыі кваліфікацыйнага турніру жаночага чэмпіянату свету — 2021 у групе 5. Спаборніцтвы пройдуць у Мінску 4—6 снежня ў палацы спорту «Уручча». Беларуская жаночая зборная сустрэнецца з камандамі Фарэрскіх астравоў і Швейцарыі.

Матэрыялы выпуску падрыхтавала Валерыя СЦЯЦКО.

ЗАО «БЕЛРЕАЛИЗАЦИЯ»
ОБЪЯВЛЯЕТ АУКЦИОН

Организатор торгов: **ЗАО «Белреализация»** (УНП 191113330), 220089, г. Минск, ул. Уманская, 54, 4-й этаж паркинга, каб. 27, тел.: (8017) 298-53-53; (8029) 690-54-09.

Продавец: **ОАО «Минский завод отопительного оборудования»** (УНП 100008064), 220073, Минск, ул. Тимирязева, д. 29, в лице управляющего по делу о банкротстве частного предприятия «Аналитик – центр», тел. +375 (17) 284-05-67.

Повторные публичные торги в форме аукциона в процедуре экономической несостоятельности (банкротства) будут проведены **02 сентября 2020 г. в 10.00,** по адресу: г. Минск, ул. Уманская, 54, 4-й этаж паркинга, каб. 27.

по проведению четвертых повторных публичных торгов в форме аукциона

№ п/п	Лот №	Предмет торгов	Инв. №	Начальная цена предмета торгов, бел. руб. с учетом НДС 20 %	Шаг торгов (5 %) от начальной цены, бел. руб.	Задаток (10 %), бел. руб.
1	10609	Формовочно-заливочный комплекс DISA, в том числе:	-	1 283 040,00	64 152,00	6 415,20
		Машина формовоч. ДИСАМАТИК в комплекте	6019			
		Барабан охлаждающий Disacool 2900	6020			
		Конвейер форм автоматический (АМС-18)	6021			
		Конвейер ленточный синхрон. (SBC)	6022			
		Виброжелоб для форм 800/1500*7000	6023			
		Виброконвейер для форм 800*25000	6025			
		Машина для подгот. формов. смеси MixerCAM	6026			
		Панель управл. для бараб. + смесепр. + конвейер	6028			
		Печь заливочная тип ОСС 35	6029			
		Управление формов. машиной Дисаматик	6035			
		Горелка комбинир. для обжига и нагрева	6038			
		Шкаф управления	6411			
2	10625	Станок токарно-карусельный 1512	1598	13 320,00	666,00	1 332,00

по проведению вторых повторных публичных торгов в форме аукциона

№ п/п	Лот №	Предмет торгов	Начальная цена предмета торгов, бел. руб. с учетом НДС 20 %	Шаг торгов (5 %) от начальной цены, бел. руб.	Задаток (10%), бел. руб.
1	11459	Автомобиль ЗИЛ-130-76 (зав. № 2819521), тип ТС поливомоечная машина, 1977 г. в., кузов № 2819521	1920,00	96,00	192,00
2	11460	Автомобиль МАЗ 53371 (рег. знак КС4281), тип ТС грузовой автомобиль, 1988 г. в., кузов № 1191	2496,00	124,80	249,60
3	11463	Автомобиль MAZ 54323 (рег. знак АР 9124-7), тип ТС грузовой седельный тягач, 1991 г. в., кузов № XTH543230M0010118	4128,00	206,40	412,80
4	11464	Полуприцеп MAZ 9397 (рег. знак А 1432 Е-7), тип ТС полуприцеп бортовой, 1991 г. в., кузов № 288	3072,00	153,60	307,20
5	11465	Автомобиль KAMAZ 55111 (рег. знак АМ7742-7), тип ТС грузовой специальный самосвал, 1991 г. в., кузов № XTC551110M0060963	3072,00	153,60	307,20
6	11468	Автомобиль ГАЗ 2325 10 (рег. знак КМ1566), тип ТС грузовой фургон, 1996 г. в., кузов № T0000653 XTH330210T1600795	2112,00	105,60	211,20
7	11469	Автомобиль Фольксваген Транспортер (рег. знак 8097КЕ), тип ТС автобус вагон, 1997 г. в., кузов № WV2ZZZ70ZVH139164	6144,00	307,20	614,40
8	11470	Автомобиль УАЗ 3909 (рег. знак КВ2862), тип ТС автомобиль грузовой, 1998 г. в., кузов № W0016100	1248,00	62,40	124,80
9	11471	Автомобиль МАЗ 53371 (рег. знак КЕ0586), тип ТС грузовой бортовой, 1998 г. в., кузов № Y3M533710W0017457	1728,00	86,40	172,80
10	11472	Автомобиль ЗИЛ 5301 БО (рег. знак КВ2731), тип ТС изотермический фургон, 1998 г. в., кузов № 029752	1728,00	86,40	172,80
11	11473	Автомобиль MAZ 54329 (рег. знак КС2308), тип ТС грузовой седельный тягач, 1999 г. в., кузов № Y3M543290X0010894	4128,00	206,40	412,80
12	11474	Полуприцеп МАЗ 9758 40 (рег. знак 0810КВ), тип ТС полуприцеп бортовой, 1999 г. в., кузов № Y3M975800X0001853	2112,00	105,60	211,20
13	11476	Автомобиль Тойота Кэмри (рег. знак 1153МІ), тип ТС легковой седан, 2003 г. в., кузов № JTDBE38K500240789	5280,00	264,00	528,00
14	11477	Автомобиль Toyota Hiace (рег. знак МА1074), тип ТС автобус вагон, 2004 г. в., кузов № JT141LHG401000151	7968,00	398,40	796,80
15	11478	Автомобиль МАЗ 551605 2121-24 (рег. знак АВ 1538-7), тип ТС грузовой самосвал, 2003 г. в., кузов № Y3M5516053000052	10848,00	542,40	1084,80
16	11479	Автомобиль Люблин 3 3324 (рег. знак АА 0867-7), тип ТС грузопассажирский вагон, 2004 г. в., кузов № Y3W3324004FNX0010	2784,00	139,20	278,40

по проведению третьих повторных публичных торгов в форме аукциона

№	Лот №	Предмет торгов	Инвентарный № согласно данным бух. учета	Начальная цена предмета торгов, бел. руб. с учетом НДС 20 %	Шаг торгов (5 %) от начальной цены, бел. руб.	Задаток (10 %), бел. руб.
1	11002	СТАНОК ТОКАР-ВИНТОРЕЗ. 1К62	896	1932,00	96,60	193,20
2	11003	СТАНОК ТОКАР-ВИНТОРЕЗ. 1К62Д	4352	3696,00	184,80	369,60
3	11004	СТАНОК ТОКАР-ВИНТОРЕЗ. 1М63	1538	3276,00	163,80	327,60
4	11005	СТАНОК РАДИАЛ-СВЕРЛ. 2Л53У	1631	3024,00	151,20	302,40
5	11006	СТАНОК ТОКАР-ВИНТОРЕЗ. 1К62	696	1428,00	71,40	142,80
6	11007	Станок П/АВТ. 6-ТИ ШПИНДЕЛЬНЫЙ	2377	8064,00	403,20	806,40
7	11008	Станок П/АВТ. 6-ТИ ШПИНДЕЛЬНЫЙ	2378	8064,00	403,20	806,40
8	11009	Станок П/АВТ. 6-ТИ ШПИНДЕЛЬН.	2382	8064,00	403,20	806,40
9	11010	Станок П/АВТ. 6-ТИ ШПИНДЕЛЬН.	2383	3528,00	176,40	352,80
10	11011	Станок СПЕЦ. ТОКАР 6-И ШПИНД.1А240СП-6 П	1747	4788,00	239,40	478,80
11	11012	Станок СПЕЦ. ТОКАР 6-И ШПИНД.1А240СП-6 П	1748	11172,00	558,60	1117,20
12	11013	Станок П/АВТ. 6-ТИ ШПИНДЕЛ. 1Б240П-6К	4112	8064,00	403,20	806,40
13	11014	Станок П/АВТ. 6-ТИ ШПИНДЕЛ. 1Б240П-6К	4113	8064,00	403,20	806,40
14	11015	Станок П/АВТ. 6-ТИ ШПИНДЕЛ. 1Б240П-6К	4114	8064,00	403,20	806,40
15	11016	Станок АВТ. ТОКАРНЫЙ 1Б240 Н-6	4269	8064,00	403,20	806,40
16	11017	Станок АВТ. ТОКАРНЫЙ 1Б240 Н-6	4270	8064,00	403,20	806,40
17	11018	Станок П/АВТ. 1Б240 П6Т-К 1Б240 Н-6	4282	8064,00	403,20	806,40
18	11019	Станок П/АВТОМАТ 1Б240 П6	4299	8064,00	403,20	806,40
19	11020	ПРЕССНОЖНИЦЫ 229А	1306	1008,00	50,40	100,80
20	11021	СТАНОК РАДИАЛ-СВЕРЛ. 2К52	1959	3276,00	163,80	327,60
21	11022	КОЛОРИМЕТР КФК-3	5031	403,20	20,16	40,32
22	11023	ШУМОМЕР ВШВ-003	5110	470,40	23,52	47,04
23	11024	ГАЗОАНАЛИЗАТОР УГ-2	5111	319,20	15,96	31,92
24	11025	ШУМОМЕР ВШВ-003	5113	470,40	23,52	47,04
25	11027	АСПИРАТОР «ТАЙФУН-С р-20-20»	5494	546,00	27,30	54,60
26	11029	ЛЮКСМЕТР Ю-116	5531	46,20	2,31	4,62
27	11030	Газоанализатор INFRALYT	5626	117,60	5,88	11,76
28	11032	Весы равноплечие лаб. ВЛР-200 с гирями	5793	79,80	3,99	7,98
29	11033	Газоанализатор Testo-350XL электронный	6170	1428,00	71,40	142,80
30	11034	ПРИБОР КФК-2 ДЛЯ ИЗМЕРЕН. КОНЦЕНТРАЦИИ ВЕ	6662	252,00	12,60	25,20
31	11035	Кондуктомер-солемер с датчиком ДП-3 «МАРК-603/1»	7445	596,40	29,82	59,64
32	11036	Шкаф сушильный ШС-80-01	7447	445,20	22,26	44,52
33	11037	СТОЛ ОСТРОВНОЙ ХИМИЧЕСКИЙ	15814	613,20	30,66	61,32
34	11038	СТОЙКА ВЕСОВАЯ	15817	81,48	4,07	8,15
35	11039	СТОЙКА ВЕСОВАЯ	15818	81,48	4,07	8,15
36	11040	СТОЙКА ВЕСОВАЯ	15819	81,48	4,07	8,15
37	11041	СТОЙКА ДЛЯ ПРИБОРОВ И РЕАКТИВОВ	15820	151,20	7,56	15,12
38	11042	СТОЙКА ДЛЯ ПРИБОРОВ И РЕАКТИВОВ	15821	151,20	7,56	15,12
39	11043	СТОЙКА ДЛЯ ПРИБОРОВ И РЕАКТИВОВ	15822	151,20	7,56	15,12
40	11044	СТОЙКА ДЛЯ ПРИБОРОВ И РЕАКТИВОВ	15823	151,20	7,56	15,12
41	11045	СТОЙКА ДЛЯ ПРИБОРОВ И РЕАКТИВОВ	15824	151,20	7,56	15,12
42	11046	СТОЙКА ДЛЯ ПРИБОРОВ И РЕАКТИВОВ	15825	151,20	7,56	15,12
43	11047	СТОЙКА УНИВЕРСАЛЬНАЯ	15826	327,60	16,38	32,76
44	11048	СТОЙКА ПРИБОРНАЯ	15828	151,20	7,56	15,12
45	11049	СТОЙКА ПРИБОРНАЯ	15829	151,20	7,56	15,12
46	11050	СТОЙКА ПРИБОРНАЯ	15830	151,20	7,56	15,12
47	11051	МОЙКА	15833	184,80	9,24	18,48
48	11052	МОЙКА	15834	184,80	9,24	18,48
49	11053	ШКАФ ВЫТЯЖНОЙ ХИМИЧЕСКИЙ	15836	823,20	41,16	82,32
50	11054	ШКАФ ВЫТЯЖНОЙ ХИМИЧЕСКИЙ	15837	823,20	41,16	82,32
51	11055	СТОЛ ПРИСТЕННЫЙ ХИМИЧЕСКИЙ	15838	327,60	16,38	32,76
52	11056	СТОЛ ПРИСТЕННЫЙ ХИМИЧЕСКИЙ	15839	327,60	16,38	32,76
53	11057	СТОЛ ПРИСТЕННЫЙ ХИМИЧЕСКИЙ	15840	327,60	16,38	32,76
54	11058	КОЛОРИМЕТР ФОТОЭЛЕКТРИЧ. КОНЦЕНТРАЦИОННЫЙ	15841	252,00	12,60	25,20
55	11059	КОЛОРИМЕТР ФОТОЭЛЕКТРИЧ. КОНЦЕНТРАЦИОННЫЙ	15842	252,00	12,60	25,20
56	11061	ШУМОМЕР Ш-1	17349	336,00	16,80	33,60
57	11062	ПРИБОР РНМЕТР РН-220	17468	117,60	5,88	11,76
58	11063	ДОЗИМЕТР ШУМА	17564	613,20	30,66	61,32
59	11064	ПРИСПОСОБЛЕНИЕ ДЛЯ ТИЛЬТРОВАНИЯ ХИМ. АНАЛ	17591	68,88	3,44	6,89
60	11065	ЩИТ ШМ-ОП 900*1200	6186	26,88	1,34	2,69
61	11066	Выпрямитель кремниев ЕПК 80/60а5	5769	302,40	15,12	30,24
62	11067	АВТОПОГРУЗЧИК -ДВ-1792 33	4464	7392,00	369,60	739,20
63	11070	СТАНОК РАД.-СВЕРЛИЛ. 2А592	549	1512,00	75,60	151,20
64	11072	СТАНОК Токар-винторез.1К625	1628	3108,00	155,40	310,80
65	11074	СТАНОК СПЕЦ.ВЕРТ.-ФРЕЗЕР.СФ-35	2355	4284,00	214,20	428,40
66	11075	СТАНОК РАДИАЛ-СВЕРЛИЛ. 2А554Ф1	4348	6384,00	319,20	638,40
67	11077	СТАНОК УНИВЕРС.-ЗАТЫЛОВ. К-96	76	1596,00	79,80	159,60
68	11078	ПРЕСС ГИДРАВЛ. П-472Б	933	2436,00	121,80	243,60
69	11079	ВАЛЬЦЫ И-2222 ЛИСТОГИБОЧНЫЕ	1727	10080,00	504,00	1008,00
70	11081	МАШИНА ЛИСТОГИБОЧНАЯ И-2222Б	4205	12180,00	609,00	1218,00
71	11082	НОЖНИЦЫ НД 3318Г ЛИСТОВ. С НАКЛОН. НОЖОМ	4410	4368,00	218,40	436,80
72	11083	ПРЕСС ГИДРАВЛ. П5Б6334	4456	24360,00	1218,00	2436,00
73	11084	НОЖНИЦЫ ГИЛЬОТИННЫЕ НГ-13	4572	6552,00	327,60	655,20
74	11085	ТРАНСФОРМАТОР СВ.ТС-500	5472	151,20	7,56	15,12
75	11086	УСТРОЙСТВО ВЫПРАМИТЕЛЬНОЕ ВДУ 506	5481	462,00	23,10	46,20
76	11087	АППАРАТ СВАРОЧНЫЙ ВД-401	6647	235,20	11,76	23,52
77	11088	ТРАНСФОРМАТОР СВ. ТС-500	6694	151,20	7,56	15,12
78	11089	Установка сварочная УГПР	6940	394,80	19,74	39,48
79	11091	ВЕСЫ РН10Ц13У В КОМПЛЕКТЕ С ГИРАМИ ГО20	4394	134,40	6,72	13,44
80	11092	ПРИБОР ИСП-1М для испыт. подшипников	5163	218,40	10,92	21,84
81	11093	Аквадистилятор эл. ДЭ-25 «СПб»	6096	336,00	16,80	33,60
82	11095	Сатуратор «Бриз-М» - автомат. газ. воды	7055	747,60	37,38	74,76
83	11096	КРАН ШАРЖИРНЫЙ КМБ-3 . 2	485	1680,00	84,00	168,00
84	11097	ВОЗДУХОДУВКА В2М10/1250	1725	924,00	46,20	92,40
85	11098	ВОЗДУХОДУВКА В2 140	2372	680,40	34,02	68,04
86	11099	КОНВЕЙЕР ДЛЯ СЛИВА ХОЛОДНОГО МЕТАЛЛА	4022	571,20	28,56	57,12
87	11100	ВАГРАНКА 5т	4701	7308,00	365,40	730,80
88	11101	Вагранка 5тн	5737	7056,00	352,80	705,60
89	11102	ЭЛЕКТРОВЕСОВАЯ ТЕЛЕЖКА Т132 Т3, инв. № 1492, весы ВСП4-5000А (3000*2000) платформенные, инв. № 6827		2074,80	103,74	207,48
90	11104	КРАН ДЛЯ ЗАГРУЗКЩ ВАГРАНОК У1660	4520	1764,00	88,20	176,40
91	11105	Ковш барабанный емкостью 900 кг	6560	2520,00	126,00	252,00
92	11106	ВИБРОПИТАТЕЛИ 196 ПТ	1488	604,80	30,24	60,48
93	11107	ВИБРОПИТАТЕЛИ 196 ПТ	1489	604,80	30,24	60,48
94	11108	ВИБРОПИТАТЕЛИ 196 ПТ	1490	604,80	30,24	60,48
95	11109	ПИТАТЕЛИ 196 АПТ	1665	596,40	29,82	59,64
96	11110	ПИТАТЕЛИ 196 АПТ	1666	596,40	29,82	59,64
97	11111	ПИТАТЕЛИ 196 АПТ	1667	596,40	29,82	59,64
98	11112	ВИБРОПИТАТЕЛЬ 196 АПТ	1869	613,20	30,66	61,32
99	11113	СТАНОК ПРОТЯЖНОЙ ДЛЯ ФОРМОВКИ СЕКЦИИ	520	3528,00	176,40	352,80
100	11114	СТАНОК ПРОТЯЖНОЙ ДЛЯ ФОРМОВКИ СЕКЦИИ	776	3528,00	176,40	352,80
101	11115	СТАНОК ПРОТЯЖНОЙ ДЛЯ ФОРМОВКИ СЕКЦИИ	777	3528,00	176,40	352,80
102	11116	ПЕСКОМЕТ 2Б93	1956	10500,00	525,00	1050,00
103	11117	ПЕСКОМЕТ ФОРМОВОЧНЫЙ 2Б 93М	2186	14448,00	722,40	1444,80
104	11118	ПИТАТЕЛЬ ТАРЕЛЬЧАТЫЙ	1729	386,40	19,32	38,64
105	11119	ПИТАТЕЛЬ ТАРЕЛЬЧАТЫЙ	1730	386,40	19,32	38,64
106	11121	Печь эл. д/прокалки худ. литья 9894.00	5620	672,00	33,60	67,20
107	11123	СМЕСИТЕЛИ ЦЕНТРОБЕЖ ЛАБОРАТОРНЫЕ	1764	3024,00	151,20	302,40
108	11124	ЭЛЕКТРОПЕЧЬ ИСТ-016	3370	6384,00	319,20	638,40
109	11125	БЕГУНЫ ЦЕНТРОБЕЖНЫЕ МО 115	525	7476,00	373,80	747,60
110	11126	БЕГУНЫ ЦЕНТРОБЕЖНЫЕ МО 115	526	7476,00	373,80	747,60
111	11127	ГЛИНОМЕШАЛКА ГОРИЗОНТАЛЬНАЯ	1058	924,00	46,20	92,40
112	11128	БЕГУНЫ 115	1327	6132,00	306,60	613,20
113	11129	Пульт управления бегунами (автоматизир)	7315	5628,00	281,40	562,80
114	11130	Сито полигональное Q=20 м3/час	7278	403,20	20,16	40,32
115	11131	Амперметр образцовый ЦА 8500/2	5767	445,20	22,26	44,52
116	11132	МИКРОНИВЕЛИР МН-2	6792	781,20	39,06	78,12
117	11133	ДИСК – 250	3334	151,20	7,56	15,12
118	11134	ДИСК – 250	3335	151,20	7,56	15,12
119	11135	ПРИБОР ДИСК – 250	17626	151,20	7,56	15,12
120	11136	ПРИБОР ДИСК – 250	17627	151,20	7,56	15,12
121	11137	ПРИБОР ППИ – 4	5019	537,60	26,88	53,76
122	11139	ПРИБОР РП-160-3	5137	77,28	3,86	7,73
123	11140	ПРИБОР РП-160-3	5138	77,28	3,86	7,73
124	11141	ПРИБОР РП-160-3	5139	77,28	3,86	7,73
125	11142	ТЕРМОМЕТР ТГС-712	5206	117,60	5,88	11,76
126	11143	ТЕРМОМЕТР ТГС-712	5207	117,60	5,88	11,76
127	11144	ТЕРМОМЕТР ТГС-712	5210	117,60	5,88	11,76
128	11145	ТЕРМОМЕТР ТГС-712	5211	117,60	5,88	11,76
129	11146	Оптиметр вертикальный ИКВ-3	5402	176,40	8,82	17,64
130	11147	ДЛИННОМЕР ВЕРТИКАЛЬНЫЙ ИЗВ-3	5404	730,80	36,54	73,08
131	11148	Комплекс для измер. давл. ИПДЦ-УХЛ4.2	5877	403,20	20,16	40,32
132	11149	Комплекс для измер. давл. ИПДЦ-УХЛ4.2	5878	403,20	20,16	40,32
133	11150	МИКРОНИВЕЛИР МН-2	6791	781,20	39,06	78,12
134	11151	Преобразователь Ф4833В ИТ4Т-05	6661	100,80	5,04	10,08
135	11152	АСЦИЛЛОГРАФ С1-67	6665	117,60	5,88	11,76
136	11153	МАНОМЕТР МП-2,5	6757	1092,00	54,60	109,20
137	11154	ПРИСПОСОБЛЕНИЕ ДЛЯ ПРОВЕРКИ ШТАНГЕНИНСТР	6846	75,60	3,78	7,56
138	11155	ПРИБОР МИП-10	6849	579,60	28,98	57,96
139	11156	ПРИБОР КВП-1 503*600	17113	184,80	9,24	18,48
140	11158	ИЗМЕРИТЕЛЬ МАЛЫХ ТОКОВ ИТ4Т-05	17353	59,64	2,98	5,96
141	11159	ШКАФ ВЫТЯЖНОЙ ХИМИЧЕСКИЙ С МОЙКОЙ	5222	327,60	16,38	32,76
142	11160	МАНОМЕТР МП-600	6758	1428,00	71,40	142,80
143	11161	УСТАНОВКА У-300 ДЛЯ ПРОВЕРКИ ЭЛ. ИЗМЕРИТ.	6794	1428,00	71,40	142,80
144	11162	МАНОМЕТР ГРУЗОПОРШНЕВОЙ МП60-0.05	18058	1512,00	75,60	151,20
145	11163	Кондиционер LG G12LH	6088	252,00	12,60	25,20
146	11164	Ваграночный комплекс № 1: ВАГРАНКА Д. 1100 (разделена 07.2014), инв. № 1423, ПОДЪЕМНИК СКИПОВОЙ, инв. № 3789, БАДЬЯ ДЛЯ СКИПОВОГО ПОДЪЕМНИКА, инв. № 3789, ВОЗДУХОДУВКА С ЭЛ. ДВИГАТЕЛЕМ 4АМН 250М2, инв. № 4489		21672,00	1083,60	2167,20
147	11165	Ваграночный комплекс № 2, ВАГРАНКА, инв. № 3615, ПОДЪЕМНИК СКИПОВОЙ, инв. № 3790, БАДЬЯ ДЛЯ СИПОВОГО ПОДЪЕМНИКА, инв. № 4541, воздухо-дувка В-2М10/1250, инв. № 7342		21840,00	1092,00	2184,00
148	11166	Автоматический комплекс Джи-Дзета, линия авт. Джи-Дзета TS-3, инв. № 6995, установка MER200 для подготовки песка, инв. № 6991, бункер для песка к линии Термошок, инв. № 6986		447720,00	22386,00	44772,00
149	11167	Печь отжига VKTP 20000/11, печь отжига (проышленная) VKTP20000/11, инв. № 7186, шкаф ШР11-73702 IP54(ВР-32), инв. № 7181		393960,00	19698,00	39396,00
150	11168	Вагранка закрытого типа 1	7050	60564,00	3028,20	6056,40
